Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

Серыя «Па вёсках нашага краю»

# Малой радзімы прыцяжэнне

*інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік*
*да 475-годдзя з часу першага згадвання*
*ў пісьмовых крыніцах вёсак Кобрынскага раёна*

## ПАВІЦЦЕ

### ЛЕЛІКАВА




Кобрын
2021

УДК 016:911.373-908(476.7)
ББК 91.9:26.89(4Беи)
М18

Серыя заснавана ў 2007 годзе

***Складальнік***
галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі
Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі *С. Д. Курачук*

М18 **Малой радзімы прыцяжэнне** : інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік да 475-годдзя з часу першага згадвання ў пісьмовых крыніцах вёсак **Павіцце** і Лелікава Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2021. – 90 с. : каляр. фат. - (Серыя «Па вёсках нашага краю»).

Інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік «Малой радзімы прыцяжэнне» прысвечаны 475-годдзю з часу першага ўпамінання ў пісьмовых крыніцах в. Павіцце і в. Лелікава Кобрынскага раёна. Выданне змяшчае значную інфармацыю аб цікавых, унікальных вёсках-юбілярах, расказвае аб падзеях далёкага мінулага і тых, што яшчэ ў многіх у памяці, славутасцях, памятных мясцінах, традыцыях, вядомых земляках. Удакладняюць інфармацыю фотаздымкі з фотагалерэі Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі, архіваў Павіццеўскай і Лелікаўскай публічных бібліятэк. У паказальніку шырока прадстаўлена бібліяграфія. Выданне разлічана на шырокае кола чытачоў, усіх, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю, яго культурай, мовай, этнаграфіяй.

**УДК 016:911.373-908(476.7)**
**ББК 91.9:26.89(4Беи)**

© Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма, 2021

# ЗМЕСТ

ПАВІЦЦЕ: КРАЯВІДЫ МАЁЙ ВЁСКІ 4

*Сельсавет памерам у адну вёску* 4

*Гістарычны агляд* 4

*Паходжанне назвы вёскі* 7

*Прыродныя ўмовы і рэсурсы* 8

*Геаграфія. Транспартныя сувязі* 9

*Шматмоўная вёска* 9

*Народныя традыцыі* 10

СУЧАСНЫ АГРАГАРАДОК 11

*Сельскагаспадарчыя арганізацыі. Гаспадаркі* 11

*Сацыяльная інфраструктура* 12

ПАМЯТНЫЯ МЯСЦІНЫ, СЛАВУТАСЦІ 15

*Свята-Прачысценская царква* 15

*Тут памяць жыве. Помнікі гісторыі* 17

*Помнікі прыроды* 18

ВЯДОМЫЯ ЗЕМЛЯКІ 20

*Ганаровыя грамадзяне аграгарадка Павіцце Кобрынскага раёна* 29

СПІС КРЫНІЦ 35

СПІС ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯЎ, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік 45

# ПАВІЦЦЕ:
# краявіды маёй вёскі

**Сярод дубраў, лугоў шырокіх,**
**Дзе песня так звонка льецца,**
**Ляжыць вялікае палескае сяло,**
**Што так прыгожа Повіццю завецца**

*Уладзімір Дзехцярук*




## Сельсавет памерам у адну вёску

Бываць сельсаветы, якія складаюцца з трох, а то і чатырох дзясяткаў вёсак. Павіцце Кобрынскага раёна адно складае сельсавет. Падобны адміністрацыйны расклад абумоўлены геаграфічным становішчам вёскі, якая размешчана крыху ўбаку ад іншых населеных пунктаў, схавалася сярод лясоў і балот на самым поўдні Кобрынскага раёна, на мяжы з Украінай. Аддаленая ад раённага цэнтра, вёска Павіцце жыве сваім спакойным, размераным жыццём. Тут з павагай ставяцца да старых звычаяў і традыцый і разам з тым адчувальныя да ўсяго новага.

### *Гістарычны агляд*

Павіцце (мясцовая назва Повітьте), вёска, цэнтр Павіццеўскага сельсавета.

Вёска Павіцце (або Повіць) Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці мае багатую гісторыю, адлічвае сваё існаванне ад XVI стагоддзя. Першае згадванне ў пісьмовых крыніцах – 25 жніўня 1546 года, сяло Паветцы Палескага ключа Ратненскага павета Каралеўства Польскага.

Верагодна, паселішча існавала задоўга да пісьмовага згадвання. Край знаходзіўся ў складзе Кіеўскай Русі да другой паловы XI стагоддзя, а потым увайшоў у Валынскае княства, з 1199 года – у Галіцка-Валынскае княства. У 1385 годзе гэтая тэрыторыя

апынулася ў складзе Вялікага Княства Літоўскага. Старажылы распавядаюць, што ў старажытныя часы сяло было размешчана ва ўрочышчы «Мистечко», дзе знаходзяць асколкі глінянага посуду: за Арэхаўскім каналам, на ўзвышаным месцы злева ад дарогі Павіцце – Дзівін.

Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай (1795) сяло знаходзілася ў складзе Расійскай імперыі, у Валынскай губерні. Трэба адзначыць, што Павіцце размяшчалася па-за вялікіх дарог, заставалася ў баку ад шляху Кобрын – Ковель, таму не падвяргалася нападу заваёўнікаў – татараў, шведаў, французаў. Транспартнай артэрыяй для жыхароў быў Арэхаўскі канал, які пабудаваны ў 1905 годзе.

У 1915 годзе Кобрыншчына акупіравана германскімі войскамі, многія жыхары сталі бежанцамі. Па ўмовах Брэсцкага міру (1918) паўднёвая частка Брэстчыны ўвайшла ў склад Украінскай Народнай Рэспублікі. Паводле Рыжскага мірнага дагавора (1921) значныя часткі Беларусі і Украіны аказаліся пад уладай Польшчы. Пачаўся новы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, і вёска Павіцце з 1921 года стала часткай Лелікаўскай гміны Камень-Кашырскага павета Палескага ваяводства. У асноўным у вёсцы пражывалі ўкраінцы: 309 дамоў, 1651 жыхар.



У 1930-я гады ў вёсцы працавалі школа, вячэрнія курсы, чытальня, тэатральныя і харавы гурткі.



.

*Хата з саламяным дахам*

У 1939 годзе Павіцце было сярод вызваленых раёнаў Заходняй Беларусі, якія далучыліся да БССР. Павіцяне ў 1940 годзе звярталіся ў Брэсцкі абласны выканаўчы камітэт з просьбай далучэння вёскі да УССР, але ім адмовілі. У пастанове Брэсцкага аблвыканкама ад 5 ліпеня 1940 года па гэтым пытанні сцвярджалася: «…*Считать необоснованным ходатайство граждан села Повитье Повитьевского сельсовета, деревень Радостово и Сварынь Радостовского сельсовета Дивинского района о присоединении села Повитье и деревень Радостово и Сварынь к Украинской ССР. Оставить вышеуказанные населённые пункты в границах Дивинского района*».

У тым жа годзе быў створаны Павіццеўскі сельскі савет, у складзе якога большасць жыхароў украінцы, некалькі сем’яў палякаў, беларусаў-усходнікаў, 57 яўрэяў. У гэты час навучанне ў школе вялося на рускай і беларускай мовах.

З 15 студзеня 1940 года Павіцце ў Дзівінскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12 кастрычніка 1940 года - цэнтр сельсавета. У склад Павіццеўскага сельсавета ўвайшлі 4 населеныя пункты: сяло Павіцце, вёска Травы, вёска Паграбішча, вёска Язвіны з прылеглымі хутарамі. У той час у вёсцы Павіцце 301 двор, 2328 жыхароў, маторны млын, пачатковая школа, сельсавет, магазін.

У Вялікую Айчынную вайну з Павіцця на фронт пайшло 137 чалавек, з іх 72 загінула. У першыя дні акупацыі захопнікі расстралялі некалькі сельскіх актывістаў, у тым ліку дырэктара школы і яго намесніка, якому было 19 гадоў і які толькі прыехаў па накіраванні і прыступіў да работы. З сяла Павіцце ў Дзівінскае гета вывезлі 57 чалавек габрэйскай нацыянальнасці, якіх пасля расстралялі.

Навакольныя лясы і балоты спрыялі дыслакацыі партызанскіх атрадаў, іх тут было нямала. А яшчэ ў лясах заселі бандэраўцы, украінскія нацыяналісты, ад якіх мясцовае насельніцтва пакутавала не толькі пад час вайны, але і некалькі гадоў пасля. Партызанскія атрады, якія злучыліся з Чырвонай арміяй у красавіку 1944 года, былі расфарміраваны, многія партызаны сталі чырвонаармейцамі. Пасля адыходу немцаў (ліпень 1944) на нейкі час у Павіцці было безуладдзе, УПА запоўніла бліжэйшыя вёскі сваімі фарміраваннямі. З-за вялікага ўплыву УПА сфарміраваць у Павіцці і Лелікава сельскія Саветы не было магчымасці. Для барацьбы з бандэраўцамі былі прыцягнуты буйныя сілы, нягледзячы на тое, што на франтах працягваліся кровапралітныя баі. У Павіцці размясцілі гарнізон войскаў МДБ, быў сфарміраваны знішчальны батальён з мясцовага насельніцтва, які ўзначаліў старшы лейтэнант дзяржбяспекі Аляксандр Чумак.

Пастунова мірнае жыццё наладжвалася. У 1947 годзе ў вёсцы працавалі хата-чытальня, бальніца, сямігадовая школа.

У 1949 годзе вяскоўцы аб’ядналіся ў калгас імя Будзёнага.

У сувязі з узбуйненнем раёнаў у жніўні 1959 года Павіццеўскі сельсавет увайшоў у склад Кобрынскага раёна. Паводле перапісу 1959 года ў Павіцці налічвалася 1732 жыхары, у 1970 годзе – 2244 жыхары.



*Так выглядела первая в селе изба-читальня, организованная в 1945 году в небольшом частном доме по инициативе молодежи. Заведовал этим очагом культуры Антон Кузьмич Бриштен.*

*З архіваў Павіццеўскай публічнай бібліятэкі*

У 1999 годзе вёска Павіцце – цэнтр саўгаса «Арэхаўскі». Дзейнічалі лясніцтва, камбінат бытавога абслугоўвання, бальніца, ветучастак, аптэка, аддзяленне сувязі, Дом культуры, бібліятэка, сталовая, сярэдняя школа, 6 магазінаў. У вёсцы 767 двароў, 1982 жыхары.

## *Паходжанне назвы вёскі*

Існуе некалькі версій аб паходжанні назвы вёскі.

Мясцовая легенда расказвае, што першапачатковае найменне вёскі - Новіць. Нібыта, у старажытныя часы гэты куток, закінуты сярод непраходных балот, пачалі засяляць людзі, якія ўцякалі ад войнаў. Прайшоўшы скрозь дрыгву і ўбачыўшы нарэшце астравок сушы, яны ўсклікалі: «Новіць!». Гэтае слова, па ўсёй верагоднасці, значыла «Новая зямля». Пазней слова трансфармавалася ў «Повіць».

Другая версія назвы таксама звязана з ландшафтам, з асаблівасцямі мясцовасці. Слова «віць» азначала мокрае, гнілое месца, балота. Дабірацца ў гэты глухі край прышлым людзям даводзілася не інакш як па драўляных насцілах з галінак - «па ветцы» або «па вецце» (Павецце/Павіцце). Да канца XX стагоддзя сяло называлася Повіць, пазней сталі называць Павіцце. Гэтая назва ўжываецца і ў цяперашні час.

Яшчэ адна версія ўзыходзіць да слова «павітуха», але мае два значэнні. З аднаго боку, павітуха - гэта павівальная бабка, з другога – назва пустазельнай расліны, якая аплятала тутэйшыя месцы. Па гэтай версіі назва вёскі паходзіць ад назвы расліны павой, якую па-мясцоваму называюць «павітуха».

Існуе і яшчэ адна трактоўка, якая звязана з тэрытарыяльным дзяленнем - ад слова «павет». Павіцце - гэта месца, дзе заканчваліся лясы-балоты і пачыналася жылая тэрыторыя.

Старажылы Павіцця яшчэ памятаюць назвы вуліц іх вёскі, якія былі да «хрушчоўскай адлігі»: Амялінка, Чорновіця, Смілныця…

Сёння вуліцы носяць іншыя назвы: Суворава, Гастэлы, Камсамольская, Інтэрнацыянальная, Калгасная... У вёсцы 16 вуліц, 7 завулкаў, працягласць якіх 27 км.






*Вуліца Савецкая*



*Вуліца Школьная*



*Вуліца Палявая*

## *Прыродныя ўмовы і рэсурсы*

Вёска Павіцце размешчана на пяшчаным востраве сярод асушаных балот Палескай нізіны. На працягу года тут пераважаюць заходнія вятры. У сярэднім за год выпадае каля 540 мм ападкаў. Асноўная іх колькасць прыходзіцца на цёплы перыяд года. Зімой частыя адлігі, снежнае покрыва няўстойлівае і складае ў сярэднім 10-15 см. Вясной і летам нярэдка засухі, на тарфяніках - замаразкі.

На тэрыторыі сельсавета знаходзіцца вялікая колькасць каналаў, прарытых яшчэ ў 60-70-я гады ў асушальных мэтах. Найбольш буйным з'яўляецца Арэхаўскі канал. Пачынаецца ён з возера Арэхавец у Валынскай вобласці, упадае ў Дняпроўска-Бугскі канал. Даўжыня канала 34 км. Пабудаваны ў 1905 годзе, рэканструяваны ў 1973 годзе.



На поўнач ад населенага пункта знаходзіцца вадасховішча «Арэхаўскае». Яно створана ў 1990 годзе, размешчана ў двух кіламетрах на поўнач ад вёскі Павіцце. Плошча вадасховішча - 1,45 кв.км, сярэдняя глыбіня - 4,57 м.

На тэрыторыі вадаёма створана фермерская гаспадарка «Жоўтая Лілія». На вадаёме прадстаўлены наступны відавы склад рыб: карп, карась, шчупак, лешч, судак, сом, чырвонапёрка, плотка, амур, таўсталоб, язь, акунь.

Асноўнымі тыпамі глебаў з'яўляюцца тарфяна-балотныя і дзярнова-падзолістыя забалочаныя. Гэта звязана з блізкім да паверхні размяшчэннем грунтавых вод.

Недалёка ад вёскі Павіцце знаходзіцца ідэальна круглае возера. Вадаём быў створаны ў 90-я гады мінулага стагоддзя для збору вады з бліжэйшых меліярацыйных каналаў. Такія азёры ёсць у Іванаўскім, Бярозаўскім і Гомельскім раёнах.



## Геаграфія. Транспартныя сувязі

Вёска Павіцце знаходзіцца ў паўднёва-ўсходняй частцы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. На ўсходзе да вёскі прымыкае тэрыторыя Драгічынскага раёна. У 12 кіламетрах на поўдзень праходзіць мяжа паміж Беларуссю і Украінай. Да ўкраінскай мяжы адсюль бліжэй, чым да Кобрына. Вёска знаходзіцца за 49 км ад раённага цэнтра Кобрына, 95 км ад абласнога цэнтра Брэста.




Бліжэйшымі населенымі пунктамі з'яўляюцца вёска Лелікава, вёска Дзівін, пасёлак Арэхаўскі, вёска Радастава.

Аўтадарогамі звязана з Маларытай, Кобрынам, Драгічынам. Праз вёску Павіцце праходзіць аўтадарога Дзівін-Радастава-Драгічын, якая дзеліць населены пункт на паўночную і паўднёвую часткі.

Па характары дарожнага пакрыцця пераважаюць грунтавыя і гравійныя дарогі. У той жа час да ўсіх важных сацыяльных аб'ектаў ідуць асфальтаваныя дарогі.




З раённым цэнтрам наладжана рэгулярная транспартная сувязь. Рэйсавыя аўтобусы і мікрааўтобусы шэсць разоў за суткі перавозяць пасажыраў па маршруце Кобрын-Павіцце.

Працягласць вёскі з захаду на ўсход - 3,9 км, з поўначы на поўдзень – 3,2 км. Агульная плошча тэрыторыі 9203 га.

## Шматмоўная вёска

Вёска Павіцце адметная сваёй мовою, паколькі яна ўвабрала элементы як беларускай, так і рускай, украінскай, польскай моў.

Нягледзячы на распаўсюджанасць літаратурнай формы беларускай мовы, значная частка сялянскага насельніцтва, асабліва старэйшыя жыхары, карыстаюцца дыялектамі. Мова павіцян насычана запазычаннямі з украінскай і польскай моў. Гэта можна тлумачыць тым, што вёска доўгі час была часткай Украіны і таксама ў свае часы знаходзілася ў складзе Польшчы.

Мова павіцян большым чынам украінская, але далёка не літаратурная, са своеасаблівым дыялектам, адрозніваецца ад мовы бліжэйшых вёсак. Часткова разумеючы ўкраінскую, польскую і беларускую мову, вы на слых зможаце разабраць працэнтаў 70 са сказанага. Фанетычныя асаблівасці гэтай гаворкі зводзяцца да таго, што ў ёй у пэўных пазіцыях няма закрытых («круглых») галосных – яны мяняюцца на адкрытыя («вузкія»): замест «як справы?» тут гавораць «ек справы?», у лес ходзяць не па ягады, а «па егоды», замест «быў у гасцях» пачуем «бэў у гасцях».

Вучні Павіццеўскага дзіцячага сада - сярэдняй школы з кіраўніком Наталляй Цецярук, настаўніцай беларускай мовы і літаратуры, сабралі і паспрабавалі сістэматызаваць дыялектныя запазычанні ў маўленні жыхароў вёскі Павіцце, а таксама зразумець іх паходжанне. Вынікам працы стаў «*Слоўнік запазычанняў дыялекту вёскі Павіцце*», які ўтрымоўвае 180 слоў. Як прыклад:

Бу́сэнь (ад украінскага *бусень*) – бусел
Вэ́лыця (ад дыял. украінскага *вилиці*) – рот
Ге́ндэ (ад польскага) – тут
Зе́ньке (ад рускага *зеница*) – вочы
Куськэ́ (ад літоўскага *kosъ*) – вілы
Малаха́йка (ад татарскага *malachai*) – шапка.

## ***Народныя традыцыі***

Павіцце — вёска надзвычай цікавая, у многім унікальная. Тут з павагай ставяцца да старых звычаяў і традыцый. У сяле беражліва захоўваецца памяць пакаленняў, адсюль бяруць вытокі народныя традыцыі. Да гэтай пары тут шануюць народныя традыцыі, навучаюць па іх дзяцей.



«Повитка - ек квитка»! Гэта аб незвычайным, яркім, прыгожым і вельмі самабытным святочным уборы мясцовых жанчын. Паненка апранала багата вышываную палоскамі чырвонага і чорнага колераў кашулю, бардовую гафрыраваную спадніцу, па-над яе - фартушок з тым жа малюнкам, талію перахапляла доўгім ярка-чырвоным поясам, на ногі абувала асаблівага фасону, на абцасе, туфлі або боцікі, а на галаву апранала «брэжы».



Галаўны ўбор народнага касцюма з вёскі Павіцце знаходзіцца ў Музеі старажытна-беларускай культуры (г. Мінск). Ён выраблены ў 1934 годзе жыхаркай вёскі Марыяй Мікалаеўнай Радыванюк, 1921 года нараджэння. У музей паступіў у 1981 годзе. Ніжняй яго часткай з’яўляецца лубяная «каробачка», якая надзявалася на прычоску. Зверху завіваўся плат. Паверх плата (па форме «каробачкі») павязваліся «брыжы» – асобны кампанент убора са сшытых паміж сабой палос рознакаляровай тканіны і стужак, упрыгожаны пацеркамі і бісерам. «Брыжы» завязваліся ззаду прышытымі да іх вузкімі тасёмкамі. Па вуглах «брыжоў» з унутранага боку прышыты пучкі рознакаляровых пер’яў, якія называюцца «пава» ці «рожкі». Плат не прышываўся ні да «каробачкі» ні да «брыжоў», у завітым выглядзе ён замацоўваў на галаве «каробачку». Галаўныя ўборы з’яўляліся важнай часткай агульнага комплексу народнага адзення і арганічным дапаўненнем яго.

# СУЧАСНЫ АГРАГАРАДОК

У 2011 годзе вёска Павіцце набыла статус аграгарадка.

## *Сельскагаспадарчыя арганізацыі. Гаспадаркі*

Вяскоўцы працуюць у ***ДСУП «Сяльгас-Павіцце»***, цэнтральная сядзіба якога знаходзіцца ў Павіцці. Асноўнымі відамі дзейнасці гаспадаркі з'яўляюцца раслінаводства і жывёлагадоўля, а найважнейшымі напрамкамі дзейнасці - вытворчасць і рэалізацыя прадукцыі раслінаводства і жывёлагадоўлі; вырошчванне і рэалізацыя маладняку буйной рагатай жывёлы; развядзенне буйной рагатай жывёлы малочнага напрамку. Па шэрагу важнейшых паказчыкаў гаспадарка ўпэўнена крочыць наперад.








Асноўным відам дзейнасці ***сялянскай (фермерскай) гаспадаркі «Суніца-Арганік»*** з’яўляецца вырошчванне ягад, арэхаў і іншых пладоў дрэў і хмызнякоў.

***Павіццеўскае лясніцтва*** не першы год становіцца лепшым сярод усіх лясніцтваў Кобрынскага лясгаса. Тэрыторыя лясніцтва складае 7 тысяч гектараў. Адным з асноўных напрамкаў дзейнасці з’яўляецца нарыхтоўка драўніны, яе вываз і рэалізацыя. Асаблівы накірунак дзейнасці лясніцтва - пчалярства. Дарэчы, у Кобрынскім лясгасе толькі два лясніцтвы займаюцца пчалярствам – Павіццеўскае і Запрудскае. Ёсць у лясніцтве свой пчальнік з 60 сем’ямі, ад кожнай атрымліваюць у сезон 20 кг мёду.




На тэрыторыі аграгарадка дзейнічаюць тры фермерскія гаспадаркі: «***Залатая рыбка»*** (рыбаводства), «***Жоўтая лілея***» (займаецца рыбаразвядзеннем і далейшым продажам рыбы) і «***Павіцьеўскае***» (асноўны від дзейнасці - вырошчванне бульбы); зарэгістраваны некалькі індывідуальных прадпрымальнікаў.

### *Сацыяльная інфраструктура*

Жыхары аграгарадка Павіцце маюць усё неабходнае для камфортнага пражывання: установы адукацыі і аховы здароўя, паштовай і тэлефоннай сувязі, прадпрыемствы гандлю і бытавога абслугоўвання.

***Установа аховы здароўя «Павіццеўская амбулаторыя ўрача агульнай практыкі»***. Амбулаторыя ўтульна размясцілася ў цэнтры аграгарадка. Малады ўрач Марына Брышцен працуе





тут некалькі гадоў урачом агульнай практыкі і валодае навыкамі ў галіне тэрапіі, хірургіі, акушэрства, педыятрыі. Калектыў амбулаторыі невялікі - усяго 8 чалавек. Тут ёсць магчымасць лячыць пацыентаў і на дзённым стацыянары, для гэтага абсталяваны дзве палаты. Для большай мабільнасці ёсць машына са сваім вадзіцелем.

***Установа адукацыі «Павіццеўскі дзіцячы сад – сярэдняя школа»***

У дзіцячым садзе – сярэдняй школе навучаюцца і выхоўваюцца 174 вучні. У 2020-2021 навучальным годзе функцыянуе 11 класаў. Для ажыццяўлення вучэбна-выхаваўчай работы ў школе ёсць 5 навучальных кабінетаў, май-стэрня, спартыўная зала, сталовая, бібліятэка, стадыён, актавая зала, кабінет карэкцыйнага развіцця, псіхо-лага, сацыяльна-педагагічнай службы, музейны пакой, камп'ютарны клас.





Адной з галоўных каштоўнасцей школы з'яўляецца вялікі (у тры залы) музей. Яго складана назваць толькі этнаграфічным, краяз-наўчым, бо па сваім змесце ён значна шырэй. Першая зала прысвечана асаблівасцям народнай культуры, мясцовага быту; другая - гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў праламленні на дадзеную мясцовасць, у трэцяй зале можна пазнаёміцца непасрэдна з гісторыяй Павіц-цеўскай школы.

***Установы культуры «Павіццеўская публічная бібліятэка***» і ***«Павіццеўскі Дом культуры***» сумесна праводзяць культурна-асветніцкую работу, накіраваную на садзейнічанне культурнаму развіццю жыхароў вёскі, на задавальненне сацыяльна-культурных патрэб насельніцтва, інфармацыйных запытаў карыстальнікаў, арганізацыю вольнага часу моладзі. Установы вядуць мэтанакіраваную работу па захаванні культурнай самабытнасці свайго рэгіёну.













*А. П. Базылюк – былы бібліятэкар, краязнаўца, сапраўдная «энцыклапедыя» старадаўніх песень вёскі*



Ёсць у аграгарадку Павіцце аддзяленне банка, пошта, працуюць чатыры крамы, з іх адна прыватная, кафэ. Не закрывалі ў вёсцы лазню, што цяпер вялікая рэдкасць.









А вось шматдзетных сем'яў не так многа, як было раней, — цяпер іх 23. Сярод іх ёсць сем’і, у якіх матулі за ўзорнае выхаванне дзяцей маюць высокую ўзнагароду – ордэн Маці: Галіна Кузіч, Надзея Любчук, Наталья Чопік, Таццяна Цецярук і інш.

На 01.01.2021 года ў аграгарадку Павіцце і аднайменным сельсавеце пражывае 1324 чалавекі.


*Шматдзетная сям’я Галіны і Руслана Кузічаў*





# СЛАВУТАСЦІ, ПАМЯТНЫЯ МЯСЦІНЫ

***Помнік архітэктуры. Свята-Прачысценская царква***



**Свята-Прачысценская царква - царква ў гонар Раства Прасвятой Багародзіцы.** Размешчана ў цэнтры вёскі Павіцце. Пабудавана ў 1911 годзе з брусоў (18х18см) пад кіраўніцтвам чэшскага майстра Гута. Асвячона 9 кастрычніка 1912 года.

Мае рысы неарускага стылю. Буйнамаштабнае збудаванне са складанай і шматпланавай аб'ёмна-прасторавай кампазіцыяй. Даўжыня 32 метры, шырыня 18 метраў, вышыня (па крыжы на званіцы) – 40 метраў. У яе аснове кубападобны высокі зруб малітоўнай залы, завершаны магутным цэнтральным 8-гранным светлавым барабанам з шатровым верхам і цыбулепадобным купалам і вуглавымі «апостальскімі» купаламі на стройных 2-ярусных шыйках. Да цэнтральнага зруба далучаюцца больш нізкія бакавыя прыдзелы, 5-гранная апсіда, працяглы бабінец і прытвор-званіца. Па вуглах цэнтральнага крыжовага зруба прырублены нізкія 3-гранныя рызніцы.

Цэнтральнае маляўнічае 5-купалле ўзбагачаецца цыбулепадобнымі купаламі над вальмавым дахам апсіды і фігурнымі 3-лопасцевымі франтонамі бакавых прыдзелаў. Вертыкальнай дамінантай кампазіцыі з'яўляецца вышынная васьмерыковая шатровая званіца з аналагічным цыбулепадобным купалкам. Архітэктурна-дэкаратыўную фактуру фасадам надае разнастайная шалёўка: вертыкальная ў цокальнай частцы, гарызантальная на сценах, дыяганальная на франтонах. Дэкор узбагачаюць вуглавыя і прасценачныя лапаткі, геаметрызаваныя ліштвы прамавугольных і стральчатых акон. Галоўны ўваход вылучаны 2-слуповым ганкам, завершаным шатром з галоўкай. У інтэр'еры пануе падкупальная прастора светлавога барабана, абапёртага праз ветразі на сцены цэнтральнага зруба. Апсіда вылучана драўляным разным 2-ярусным іканастасам.

Мастацкую каштоўнасць маюць абразы на дошках XVII-XVIII стагоддзяў: «Святы велікамучанік Дзмітрый» (1745), «Божая Маці Адзігітрыя», «Ісус Хрыстос», абразы «Спас

Пантакратар». У інтэр’еры храма галоўны элемент – 2-ярусны драўляны разны іканастас, выкананы ў пачатку ХХ стагоддзя.





У архітэктурна-стылявой структуры відавочныя спалучэнні традыцыйнага народнага драўлянага дойлідства (разьба на навесах ганкаў, барабанах і інш.), рэтраспектыўна-рускага (планіроўка, форма і канструкцыя званіцы, 5-купалле асноўнага аб’ёму, выкарыстанне 3-лопасцевых какошнікаў і інш.) і неарускага (ламаныя абрысы завяршэння галоўнага барабана, падзораў цвінтара) стыляў.

У векавым жыцці храма былі розныя перыяды, але ніколі тут не прыпыняліся набажэнствы. У 60-я гады ХХ стагоддзя мясцовыя ўлады прынялі рашэнне зачыніць царкву пад падставай, што яна, нібыта, знаходзіцца ў аварыйным стане. Але прыхаджане звярнуліся са скаргай у вышэйстаячыя органы. Камісія з Мінска не дазволіла закрыць царкву. Храм працягваў дзейнічаць. Мясцовыя ўлады распачалі другую спробу перашкодзіць правядзенню набажэнстваў. Забаранілі званіць у званы, а на слупе, недалёка ад царквы, усталявалі гучнагаварыцель, падключыўшы яго да радыётрансляцыйнай сеткі, каб заглушаць спевы ў царкве. Царкву абклалі празмерным падаткам. Але ўсе гэтыя нягоды храм з годнасцю вытрымаў, бо не слабела вера ў павіцян.



Першым настаяцелем і будаўніком храма быў святар Ігнат Паўловіч (1911-1920).

З 2004 года настаяцелем царквы з'яўляецца Віктар Бойцік.

Царква дзейнічае. Гэта помнік драўлянага дойлідства, які ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

У 2011 годзе Павіцце ўрачыста адзначыла 100-годдзе Прачысценскай царквы, 2021 год таксама юбілейны (110 гадоў).

Царква ў гонар Раства Прасвятой Багародзіцы ў аграгарадку Павіцце заўсёды была цэнтрам духоўнага жыцця ў вёсцы і застаецца ім.

# ТУТ ПАМЯЦЬ ЖЫВЕ

## *Помнікі гісторыі*

У вёсцы тры помнікі ахвярам, партызанам і воінам Вялікай Айчыннай вайны.

Асноўны манумент у выглядзе маці, якая смуткуе, стаіць на плошчы. Гэта ***помнік землякам,*** загінуўшым у Вялікую Айчынную вайну. У той вайне ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі загінулі 76 аднавяскоўцаў. На ўшанаванне іх памяці ў 1982 годзе каля клуба ўстаноўлены помнік – скульптура маці, якая смуткуе, а побач - стэла з імёнамі загінуўшых.






На вясковых могілках пахаваны 20 партызан і мірныя жыхары, загінуўшыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1967 годзе ўстаноўлены ***помнік.***





## *Памятны знак*

На прыродным матэрыяле, камяні, вышынёй звыш двух метраў дошка з надпісам:

«*Село Повить в 1943 г. было освобождено и до дня прихода Советской Армии 21 июня 1944 г. находилось в руках партизан*».



## *Помнікі прыроды*

### *Мясцовы батанічны помнік прыроды «Клішча»*




У 1990 годзе было прынята рашэнне выканаўчага камітэта Брэсцкага абласнога Савета народных дэпутатаў ад 26 верасня 1990 года № 286 «Аб стварэнні Дзяржаўнага батанічнага заказніка абласнога значэння "Клішча"». Створаны ён быў для захавання ўнікальных, каштоўных у экалагічным і навуковым плане астраўных лесакустарнікавых масіваў натуральнага паходжання, у складзе флоры якіх адзначаюцца рэдкія і знікаючыя віды раслін.




У 2009 годзе рашэннем Кобрынскага раённага выканаўчага камітэта ад 21 красавіка 2009 года № 538 батанічны заказнік абласнога значэння «Клішча» пераўтвораны ў мясцовы батанічны помнік прыроды «Клішча». Стварэнне батанічнага помніка прыроды абумоўлена неабходнасцю захавання і аднаўлення ў натуральным стане каштоўнага ў навуковым і культурным адносінах рэдкага віду расліны «Венерын чаравічак сапраўдны», які занесены ў Чырвоную кнігу СССР, Чырвоную кнігу БССР.



Тэрыторыя помніка прыроды «Клішча» размешчана ва ўгоддзях Павіццеўскага лясніцтва Кобрынскага вопытнага лясгаса. Пляц паўночнага масіва - 8,6 га, паўднёвага - 9,5 га. Агульная плошча мясцовага батанічнага помніка прыроды «Клішча» складае 18,1 га.

***Ландшафтны заказнік «Званец»***




Гонарам павіцян з'яўляецца ландшафтны заказнік «Званец», які прымыкае да іх зямлі, мае статус дзяржаўнай прыродаахоўнай установы рэспубліканскага значэння.




Тэрыторыя заказніка мае статус водна-балотнага ўгоддзя міжнароднага значэння (Рамсарскай тэрыторыі) і міжнародны статус ключавой арніталагічнай тэрыторыі.

Заказнік «Званец» быў заснаваны ў 1996 годзе як біялагічны ў мэтах захавання эталонных участкаў натуральных балотна-лугавых і лясных угоддзяў з багатым раслінным і жывёльным светам. У 2010 годзе пераўтвораны ў ландшафтны заказнік.

Званец з'яўляецца адным з найбуйнейшых нізінных балот не толькі ў Беларусі, але і ва ўсёй Еўропе. Агульная плошча заказніка складае 15873 га. Выдзелена 10 раслінных супольнасцей, якія адносяцца да катэгорыі рэдкіх. Акрамя таго, балота дае прытулак цэламу шэрагу рэдкіх жывёл і раслін. Усяго на балоце Званец гняздуецца 110 відаў птушак, 21 з якіх занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Сярод іх - глабальна знікаючыя вяртлявая чаратоўка, вялікі арлец, драч і дубальт.



Міжнародная значнасць балота Званец вызначаецца, у першую чаргу, падтрыманнем буйнейшай у свеце папуляцыі вяртлявай чаратоўкі (Acrocephalus paludicola), якая лічыцца самай рэдкай пявучай птушкай Еўропы, і іншых відаў, якія знаходзяцца пад глабальнай пагрозай знікнення. Шмат у чым дзякуючы гэтаму «Званец» быў прызнаны тэрыторыяй, важнай для птушак і Рамсарскім угоддзем.

# ВЯДОМЫЯ ЗЕМЛЯКІ

**Біяграфія кожнай вёскі складаецца з лёсу людзей.**



**БРЫШЦЕН Антон Пятровіч.** Нарадзіўся 6 жніўня 1928 года ў сяле Павіцце ў сялянскай сям'і. У 1935 годзе паступіў у Павіццеўскую школу. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны скончыў 5 класаў няпоўнай сярэдняй школы.

У час вайны ў зіму 1943 года аказваў пасільную дапамогу савецкім партызанам у абмалоце збожжа і адпраўцы фуражу ў партызанскі лагер. У 1944 годзе пасля вызвалення Павіцця ад нямецкай акупацыі дапамагаў аднаўляць разбураную вайной народную гаспадарку (радыёфікацыя, тэлефонная сетка і іншыя працы).

З 1 кастрычніка 1947 года па 7 лістапада 1948 года загадваў Павіццеўскай хатай-чытальняй.

У Растове-на-Доне закончыў сярэднюю школу (10 класаў) без адрыву ад службы (там служыў у войсках МУС). З 1944 года - член ВЛКСМ. З 8 лістапада 1948 года па 16 лістапада 1953 года служыў у спецчастках МУС.

З 1953 па 1955 год - дырэктар Павіццеўскага СДК. З лютага 1955 года па лістапад 1956 года - сакратар Павіццеўскага сельскага Савета.

Лістапад 1956 года - верасень 1957 года - звыштэрміновая служба ў Савецкай Арміі.

З кастрычніка 1957 года па ліпень 1962 года працаваў ваенруком у Рубельскай сярэдняй школе Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. З 1959 года - у КПСС. З ліпеня 1962 года зноў прызваны ў рады Савецкай арміі, служыў на звыштэрміновай службе да лістапада 1978 года. У 1972 годзе завочна закончыў Столінскі сельскагаспадарчы тэхнікум.

З лютага 1979 года па 1985 год працаваў бухгалтарам у Кіеўскім аблваенкамаце. Супрацоўнічаў у друку, апублікаваў больш за 200 артыкулаў у розных перыядычных выданнях.

Узнагароджаны за бездакорную службу дванаццаццю дзяржаўнымі ўзнагародамі і двума знакамі, у тым ліку «Выдатнік ВПС», «Выдатны дарожнік».



**ДЗЕХЦЯРУК Уладзімір Іванавіч** – паэт, пісьменнік, гістарычны і літаратурны даследчык, дзеяч беларускай дыяспе).ры ў Эстоніі.

Нарадзіўся 24 студзеня 1953 года ў вёсцы Павіцце ў сям'і настаўнікаў. Цёплыя бацькоўскія адносіны, разнастайнасць інтарэсаў бацькі – даследчыка, мовазнаўца, і яго патрабавальнасць у выхаванні дзяцей з'явіліся добрым падмуркам для развіцця творчай натуры будучага паэта.

Пасля заканчэння ў 1972 годзе Брэсцкага чыгуначнага тэхнікума Уладзімір

быў накіраваны ў Казахстан, дзе працаваў у Сары-Шаганскай дыстанцыі сігналізацыі і сувязі электрамеханікам і начальнікам чыгуначнай станцыі.

У 1973 годзе служыў на Ціхаакіянскім флоце на падводнай лодцы. Скончыў ва Уладзівастоку курс вучэбнага атрада падводнага плавання, а затым служыў на атамнай падводнай лодцы.

У 1976 годзе стаў студэнтам факультэта «Аўтаматыка, тэлемеханіка і сувязь» Беларускага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту. Удзельнічаў у пяці студэнцкіх будатрадах, якія працавалі ў Беларусі, Карэліі, Комі, Сібіры.

Па размеркаванні накіраваны на працу ў Эстонію, дзе трапіў у пагрузачна-транспартнае ўпраўленне ВА «Эстонсланец». За пяць гадоў работы на аб’яднанні прайшоў шлях ад электрамеханіка да начальніка ўчастка.

Але не толькі працоўныя поспехі выдзяляюць Уладзіміра. З першых месяцаў жыцця ў Эстоніі ён актыўны ўдзельнік культурных мерапрыемстваў на сваім прадпрыемстве і ва ўсім горадзе Кохтла-Ярве. Ён капітан каманды ў конкурсе «Ану, шахцёры!». Жыхары горада прывыклі чытаць на старонках мясцовай газеты артыкулы і вершы Уладзіміра Дзехцерука, якія заўсёды цікавыя, адрозніваюцца добрым веданнем справы, актуальнасцю.

У 1988 годзе разам з А. Лапышавым, С. Сотчанка, Л. Валуём і К. Станкевічам Уладзімір Дзехцярук распачаў беларускі рух у Эстоніі, быў абраны ў раду Беларускага культурнага згуртавання г. Таліна і праз год стварыў у г. Кохтла-Ярве Беларуска-эстонскае згуртаванне «БЭЗ». У 1998 годзе добраахвотна выйшаў з «БЭЗу» і пачаў супрацоўнічаць са згуртаваннем беларусаў «Спадчына» ў г. Нарва. Доўгі час дапамагаў рабіць радыёперадачы на хвалях «Бацькаўшчыны» для беларусаў Эстоніі, быў дэлегатам з'езда беларусаў блізкага замежжа, арганізаваў паездку эстонскага камернага хору ў Гомель, пяць веласіпедных вандровак з Эстоніі ў Беларусь, шмат такіх жа цікавых вандровак па самой Эстоніі. Захапіўся краязнаўствам, геаграфіяй і гісторыяй Эстоніі.

Друкаваўся ў газетах «Беларус» (ЗША), «Літаратура і мастацтва», «Чырвоная змена», «Эстония», «Молодёжь Эстонии», «Северное побережье», «Боевая вахта», «Кобрынскі веснік» і інш. Усё жыццё сябруе з гітарай.

Інтарэсы гэтага чалавека шматгранныя: аматар веласіпедных падарожжаў, гістарычны і літаратурны даследчык, майстар, як кажуць, на ўсе рукі. І паэт, пісьменнік.




У 1995 годзе ў талінскім выдавецтве «Інгры» У. Дзехцярук выдаў першую кніжку вершаў і апавяданняў «Сярод белых эстонскіх начэй». У 1999 годзе надрукаваў другую кніжку вершаў «Трылабітавы бераг», а на працягу 2000 года напісаў кнігу прозы «Кроплі лёсу».

Чацвёртую кнігу «Повіць, абшары, людзі, час» Уладзімір Іванавіч цалкам прысвяціў роднай вёсцы. У ёй аўтар выкарыстаў багаты матэрыял, які быў сабраны некалі бацькам, настаўнікам па прафесіі, паважаным чалавекам. Гэта запісы аб шматлікіх падзеях, што ў розныя часы адбываліся на тэрыторыі вёскі і паблізу яе, аб людзях з незвычайнымі лёсамі, старыя здымкі і г. д. Уладзімір Дзехцярук дапоўніў звесткі бацькі ўласнымі цікавымі знаходкамі не толькі ў межах роднага кутка, але і ў іншых месцах і асабліва ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі.

Праз усю лірыку Уладзіміра Дзехцерука праходзяць вобразы роднай Беларусі. Шчырая любоў да Бацькаўшчыны, боль за яе мінулае, трывога за будучыню, за пакутлівы лёс роднай мовы, заклік да беларусаў адрадзіць пачуццё нацыянальнай годнасці - усё

гэта ў шматлікіх вершах і апавяданнях аўтара. А яшчэ тонкі гумар і глыбокі роздум аб агульначалавечых праблемах і каштоўнасцях.

Разумны, талерантны беларус шануе народ Эстоніі, дзе наканавана жыць, і любіць Беларусь. Час ад часу Уладзімір Іванавіч наведвае родныя мясціны, бывае не толькі ў Павіцці, але і ў адметных куточках Беларусі.

Лёс Уладзіміра Дзехцерука - гэта лёс сотняў і тысяч беларусаў, якія апынуліся за межамі Радзімы, але не здрадзілі ёй сэрцам і думкамі. У іх, як і ў паэта, не раз сціскаецца сэрца ад думкі:

Беларусь! Ты далёка- далёка...
Не разблытаць жыццёвы клубок...
Я стаю, а па небе аблокі,
Быццам думкі, плывуць у твой бок.

*(«Сярод белых эстонскіх начэй»).*

**КУЗІЧ Уладзімір Рыгоравіч** – ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь, кавалер ордэна «Знак Пашаны» і ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга.



Нарадзіўся 23 лютага 1940 года ў вёсцы Павіцце Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці ў мнагадзетнай сялянскай сям'і. Пасля заканчэння школы – служба ў арміі ў Кіеве.

У 1972 годзе закончыў факультэт прыродазнаўства Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна.

Працоўную дзейнасць пачаў з 1963 года ў г. Чалябінску (Расія), куды быў накіраваны па камсамольскай пуцёўцы на будаўніцтва металургічнага завода.

Некалькі гадоў працаваў там, потым вярнуўся на Кобрыншчыну. З 1965 па 1971 год займаў пасады інструктара Кобрынскага райвыканкама, старшыні Павіццеўскага сельскага Савета. Гэты час Уладзімір Рыгоравіч успамінае як гады свайго станаўлення, назапашвання вопыту работы з людзьмі.

Усё жыццё У. Р. Кузіча звязана з сельскай гаспадаркай, праблемамі і клопатам сялянства. У 1971-1973 гадах працаваў намеснікам старшыні калгаса імя Чкалава Кобрынскага раёна (СВК «Верхалескі»). Паралельна закончыў курсы падрыхтоўкі кіраўнічых кадраў у Гродзенскім сельскагаспадарчым інстытуце.

1973 год стаў пераломным, ключавым у кар'еры маладога кіраўніка. У 33-х гадовым узросце Уладзімір Кузіч прызначаны на пасаду старшыні калгаса імя Дзімітрава Кобрынскага раёна (цяпер ААТ «Стрыгава»), якім ён кіраваў трыццаць пяць гадоў. Пры ім калгас увайшоў у дзясятку лепшых гаспадарак Брэстчыны. Дзякуючы высокім прафесійным і арганізатарскім здольнасцям Уладзіміра Рыгоравіча, правядзенню механізацыі і мадэрнізацыі вытворчасці, калгас штогод атрымліваў высокія паказчыкі ў вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі і раслінаводства. Уладзімір Рыгоравіч першым у раёне і адным з першых у вобласці перавёў ААТ «Стрыгава» на гаспадарчы падрад. Ён скрупулёзна вывучаў вопыт лепшых аграрнікаў не толькі Беларусі і блізкага замежжа, але

і краін Еўропы: Германіі, Польшчы, Францыі, Даніі, Балгарыі. Паглядзець на ферму, пабудаваную па самых перадавых еўрапейскіх тэхналогіях, прыязджалі ў тыя часы нават з вобласці.

Асноўную ўвагу старшыня надаваў не толькі вытворчай, але і сацыяльнай сферы. Шмат чаго рабілася ў плане добраўпарадкавання населеных пунктаў, якія ўваходзілі ў склад калгаса: асфальтаваліся дарогі, газіфіцыравалася в. Стрыгава, будаваліся дзясяткі сучасных дамоў, царква, Дом культуры, кафэ, ФАП, лазня. Людзі атрымлівалі годную зарплату за сваю працу і мелі магчымасць для паўнацэннага адпачынку.

У. Р. Кузіч пайшоў на заслужаны адпачынак у 68 гадоў, пакінуўшы квітнеючым не толькі гаспадарку, але і цэнтральную сядзібу вёскі Стрыгава.

Уладзімір Рыгоравіч актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці раёна. З 1991 па 2000 год з'яўляўся старшынёй Савета калгасаў Брэсцкай вобласці, з 2000 па 2009 год - старшынёй Брэсцкага аграпрамысловага саюза. Тройчы выбіраўся дэпутатам Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў. У перыяды дэпутацкай дзейнасці ўзначальваў пастаянную камісію па сельскай гаспадарцы абласнога Савета дэпутатаў. З красавіка 2011 года і па сённяшні дзень Уладзімір Рыгоравіч - старшыня Кобрынскай раённай арганізацыі Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў.

За працоўныя заслугі неаднаразова ўзнагароджваўся дзяржаўнымі ўзнагародамі: ордэны «Знак Пашаны» (1978) і «Працоўнага Чырвонага Сцяга» (1986), юбілейны медаль да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна «За доблесную працу» (1970). У 1999 годзе прысвоена ганаровае званне «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь». У 2007 годзе У. Р. Кузічу аб’яўлена Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за мужнасць і адвагу, праяўленую ў выратаванні дзяцей на вадаёме. У дзень 75-годдзя Кобрынскага раёна рашэннем Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў № 37 ад 13 студзеня 2015 года Уладзіміру Рыгоравічу Кузічу прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».

**КУЗІЧ Міхаіл Міронавіч**. Нарадзіўся 4 лютага 1945 года ў вёсцы Павіцце ў шматдзетнай сям’і. На долю хлопчыка выпалі ўсе выпрабавані пасляваеннага часу.



Вучыўся ў мясцовай школе (закончыў 7 класаў), потым у вячэрняй. З дзяцінства Міхаіл вельмі любіў гісторыю, асабліва гісторыю роднага краю. І гэтую любоў ён пранёс праз усё жыццё.

У 1964 годзе – служба ў радах Савецкай арміі. Пасля арміі працаваў на будоўлях. Закончыў Магілёўскі будаўнічы тэхнікум (цяпер Магілёўскі архітэктурна-будаўнічы каледж). Працаваў на розных пасадах у будаўнічай галіне.

Нягледзячы на тое, што ўжо працяглы час Міхаіл Міронавіч жыве ў Жабінцы, ён ніколі не забывае пра сваю родную вёску. Напісаў рукапіс «*Моя малая родина – с. Повитье. Исторические повествования*», у якім падрабязна і з вялікай любоўю расказаў пра вёску Павіцце, яе гісторыю, знакамітых землякоў, духоўным жыцці жыхароў вёскі. З дазволу аўтара нейкая інфармацыя выкарыстоўвалася і для паказальніка «Малой радзімы прыцяжэнне», за што супрацоўнікі бібліятэкі ўдзячны Міхаілу Міронавічу.

**КУЗІЧ Сцяпан Касьянавіч** нарадзіўся ў 1904 годзе ў сяле Повіць (цяпер Павіцце Кобрынскага раёна). У 1915 годзе разам з бацькамі быў вывезены ў ліку бежанцаў у Самарскую губерню, пасёлак Дуван. Вучыўся Сцяпан у мясцовай школе. У 1921 годзе яго бацькі вярнуліся ў сяло Повіць, а юнак застаўся ў пасёлку працягваць вучобу.



*З архіваў М. М. Кузіча*

Пасля заканчэння школы Сцяпан Кузіч паступае ў Ленінградскі ўніверсітэт, затым уступае ў рады ВКП(б). Пасля вучобы на курсах марксізму-ленінізму пры ЦК ВКП(б) яго накіроўваюць на працу ў Казахскую ССР. Пачаўшы працоўную дзейнасць з пасады загадчыка агітацыйна-прапагандысцкага аддзела Алма-Ацінскага гаркама партыі, прапрацаваў на гэтай пасадзе да 1936 года. Затым Сцяпана Касьянавіча прызначаюць наменікам загадчыка аддзела партыйнай прапаганды і агітацыі Казкрайкама. Аналагічную пасаду ён атрымлівае ўжо ў ЦК КП(б) Казахскай ССР. З марта 1938 года Сцяпан Кузіч - сакратар Цэнтральнай выбарчай камісіі Казахскай ССР. У 1937-1938 гадах - кандыдат у члены ЦК КПК.

Узлёт Сцяпана Касьянавіча па партыйнай лесвіцы быў імклівым. Падзенне ж было яшчэ імклівей і скончылася для яго турмой. Даносы і паклёп адзін на аднаго ў той час былі масавымі. 1 чэрвеня 1938 года Сцяпан Кузіч быў арыштаваны. Рэабілітаваны 7 сакавіка 1956 года Вярхоўнай калегіяй Вярхоўнага Суда СССР за адсутнасцю складу злачынства. І ў тым жа 1956 годзе Сцяпан Касьянавіч наведаў сваю малую радзіму - сяло Павіцце.

Да 1960 года С. К. Кузіч працаваў намеснікам старшыні па радыёвяшчанні і тэлебачанні пры Савеце Міністраў Казахскай ССР. Пазней і нават пасля выхаду на пенсію ён працягваў працаваць, выкладаў гісторыю КПСС у інстытутах Алма-Аты.

Памёр Сцяпан Касьянавіч Кузіч у 1986 годзе ў г. Алма-Ата.

У пасёлку Дуван Самарскай вобласці (былой Ульянаўскай) імем Сцяпана Кузіча названа вуліца і школа, у якой ён вучыўся.

**САЎЧУК Дзмітрый Ксенафонтавіч.** Нарадзіўся 21 верасня 1898 года ў сяле Повіць Валынскай губерні (цяпер Павіцце Кобрынскага раёна). Вучыўся ў Повіцьеўскім пяцікласным вучылішчы, пасля паспяховага заканчэння якога быў адпраўлены ў г. Львоў для далейшай вучобы. Так як Дзмітрый быў адораным вучнем, яго залічылі на вучобу за казённы рахунак.



*З архіваў М. М. Кузіча*

У г. Львове ён сустрэў Першую сусветную вайну і ў 1915 годзе быў эвакуіраваны ў Маскву. Юны Дзмітрый акунуўся ў вір рэвалюцыйных падзей. Увасобіўшы адну з ідэй рэвалюцыі «Отречёмся от старого мира», ён змяніў імя, імя па бацьку, прозвішча. Магчыма, у памяць аб вучобе ў г. Львове прозвішча выбраў сабе «Львоў», нацыянальнасць рускі і стаў Львоў Віктар Канстанцінавіч. Добраахвотнікам уступае ў Чырвоную Армію і ў партыю бальшавікоў. Ваяваў на франтах грамадзянскай вайны, камандаваў узводам, ротай. Пасля грамадзянскай вайны лёс закінуў яго ў Сярэднюю Азію.

У 1926 годзе Дзмітрый Саўчук закончыў аб'яднаную ваенную школу ў Ташкенце. Быў намеснікам начальніка штаба палка па аператыўнай частцы, потым ад'ютантам начальніка ўпраўлення пагранічнай аховы.

Пакінуўшы ваенную службу, Дзмітрый (Віктар) мяняе вектар сваёй дзейнасці. У 1929 годзе ён паступае ў Ленінградскі горны інстытут. Пазней, у 1933 годзе, заканчвае Ленінградскі індустрыяльны інстытут па спецыяльнасці «інжынер-металург».

Сваю працоўную дзейнасць пачынае на Пуцілаўскім заводзе (пасля 1934 года - завод імя Кірава). Пачынаў памочнікам майстра, менш чым праз год ён - начальнік цэха. Прайшоўшы стажыроўку ў Бельгіі, кар'ерны рост Дзмітрыя (Віктара) стаў яшчэ імклівей. Па вяртанні з замежнай камандзіроўкі яго назначаюць начальнікам мартэнаўскага цэха, потым галоўным металургам завода, выбіраюць сакратаром партыйнага камітэта завода. У студзені 1938 года атрымаў прызначэнне дырэктарам завода імя Кірава, у тым жа годзе - народным камісарам машынабудавання.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Д. К. Саўчук працуе дырэктарам на адным з абаронных заводаў г. Новасібірска. Пасля вайны яго адпраўляюць у Германію ўпаўнаважаным Міністэрства транспартнага машынабудавання. Пасля вяртання з Германіі і да выхаду на пенсію Дзмітрый (Віктар) працаваў дырэктарам некаторых прадпрыемстваў г. Масквы.

У 1954 годзе яго маці атрымала кароткі ліст: «Мама, я жывы!» Толькі пасля гэтага ў Саўчука пабывалі многія сваякі, аднавяскоўцы.

Памёр Дзмітрый Ксенафонтавіч Саўчук (Львоў Віктар Канстанцінавіч) у 1976 годзе ў Маскве.

**ЦЕЦЯРУК Арсеній Мікалаевіч** - архітэктар, самадзейны паэт і кампазітар, грамадскі дзеяч украінскай меншасці ў Беларусі.



Нарадзіўся 2 студзеня 1941 года ў вёсцы Травы Повіцьеўскага сельсавета Дзівінскага раёна (злілася з вёскай Павіцце Кобрынскага раёна) Брэсцкай вобласці. У 1958 годзе скончыў Павіццеўскую сярэднюю школу. У школе ў Арсенія выявіліся здольнасці да малявання і ігры на музычных інструментах: яго малюнкі размяшчалі ў школьнай насценнай газеце, актыўна ўдзельнічаў у гуртку мастацкай самадзейнасці. Баян і песня суправаджалі ўсё яго жыццё.

Закончыўшы школу, Арсеній Цецярук пачаў працаваць у школе лабарантам. У 1960–1963 гадах служыў у Савецкай арміі.

У 1963-1968 гадах вучыўся на мастацка-графічным факультэце Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута. Пасля заканчэння інстытута працаваў выкладчыкам чарчэння, малявання і працы ў СШ № 19 г. Брэста.

З 1969 года па 1987 год Арсеній Цецярук быў кіраўніком будаўнічага сектара ў Брэсцкім аддзеле праектнага інстытута «Белкаапправект». У 1969 годзе пераведзены на пасаду старшага архітэктара групы генплана і вертыкальнай планіроўкі; з 1973 года - выконваючы абавязкі кіраўніка групы архітэктараў; з 1975 года - кіраўнік групы архітэктараў. Прыняты ў Саюз архітэктараў БССР (1987).

У 1987 годзе А. М. Цецярук перайшоў на працу ў Брэсцкую дзіцячую мастацкую школу (з 2015 года – дзіцячая школа выяўленчых мастацтваў імя А. А. Алонцава) педагогам па малюнку, жывапісу, кампазіцыі. У 1991 годзе яму прысвоена вышэйшая кваліфікацыйная катэгорыя. Шмат сіл аддаваў эстэтычнаму выхаванню дзяцей. Мастак пісаў у тэхніцы акварэлі, удзельнічаў у выставах, у Брэсце правёў свае дзве персанальныя выставы (2001, 2007).

На пенсію выйшаў у 2011 годзе.

З 1990 года Арсеній Мікалаевіч актыўна ўключыўся ў работу ўкраінскіх грамадскіх арганізацый «Просвіта» на Брэстчыне: першы намеснік старшыні грамадскага аб’яднання «Просвіта Берестейщини», член украінскага педагагічнага саюза «Берегиня», член праўлення Украінскага грамадска-культурнага аб’яднання Брэсцкай вобласці.

У той жа час Арсеній Цецярук вядзе творчую дзейнасць па зборы і музычнай апрацоўцы народных песень сваёй малой радзімы. У 2003 годзе выйшаў яго зборнік песень на ўкраінскай мове «Пісні мого села», у які ўвайшлі больш за 40 аўтарскіх і 50 народных песень, якія спяваюць у родным сяле на ўкраінскай мове.

Наступны зборнік «Поліські передзвони» (2016) уключыў больш 40 песень про «найміліше, найдоріжше, кохання до рідного краю», у яго ўвайшлі ўкраінскія народныя песні, запісаныя на Берасцейшчыне, і аўтарскія творы на словы ўкраінскіх і берасцейскіх паэтаў пра жыццё, каханне да жанчыны, любоў да палескага краю. У 2020 годзе ў рамках ІІІ Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Берасцейскі мір у кантэксце гісторыі і культуры Усходняй Еўропы» ў намінацыі «Папулярызацыя мастацкай творчасці» за выданне кнігі «Поліські передзвони» Арсеній Цецярук атрымаў літаратурную прэмію імя Васіля Дмытрыюка, якая штогод уручаецца аўтарам з Беларусі, што пішуць на ўкраінскай мове.

Арсеній Мікалаевіч з’яўляўся ўдзельнікам хору «Галасы Палесся», які быў створаны ў 1994 годзе Ігарам Чэрнікам. З 1996 года хорам кіравала Людміла Чаберкус. Сабраныя і напісаныя А. М. Цецярком песні з яго зборніка «Пісні мого села» ўпрыгожылі рэпертуар калектыву. Таксама фалькларыст папулярызаваў украінскую народную песню на сторонках газеты «Голос Берестейщини».

Узнагароджаны Ганаровымі граматамі Дзяржбуда БССР (1979), БКС і БРК прафсаюза (1980), дыпломам першай ступені Дзяржаўнага камітэта БССР па справах будаўніцтва (1986), Ганаровымі граматамі ўпраўлення культуры Брэсцкага гарвыканкама (2001, 2006), граматай Міністэрства культуры Беларусі, Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры (2004), граматамі Генеральнага консульства Украіны ў г. Брэсце (2006, 2007), граматай цэнтральнага праўлення Усеўкраінскага таварыства «Просвіта» імя Т. Шаўчэнкі (1999), граматай Украінскай сусветнай каардынацыйнай рады (1992), падзякай Генеральнага консульства Украіны ў г. Брэсце (2010), падзякай старшыні Валынскай абласной дзяржаўнай адміністрацыі (2011) і інш.

У 2018 годзе на вечары-памяці «Пясняр Палесся», прысвечаным 120-годдзю з дня нараджэння нашага земляка, паэта Дзмітрыя Фалькоўскага, які праводзіла Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка сумесна з грамадскім аб’яднаннем «Украінскі навукова-педагагічны саюз «Берагіня», А. М. Цецярук выступаў з музычнымі нумарамі і падараваў кобрынскім чытачам сваю кнігу «Поліські передзвони».

Арсеній Мікалаевіч Цецярук памёр 31 ліпеня 2020 года, завяшчаў пахаваць сябе ў родным Павіцці побач з бацькам і маці.

## У в. Павіцце ёсць свае ардэнаносцы, якія атрымалі высокія ўзнагароды за працоўную доблесць



**БІЮМЕН Андрэй Андрэевіч**. Нарадзіўся 6 снежня 1936 года ў вёсцы Повіць (цяпер Павіцце Кобрынскага раёна) у сялянскай сям'і. Закончыў сем класаў мясцовай школы.

Працаваў механізатарам у саўгасе «Арэхаўскі» (цяпер ДСУП «Сяльгас-Павіцце»).

У 1977 годзе ўзнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

Памёр 6 снежня 2002 года.



**ЖУК Аляксандра Еўдакімаўна**. Нарадзілася 25 лютага 1932 года ў вёсцы Повіць (цяпер Павіцце Кобрынскага раёна) у сялянскай шматдзетнай сям'і.

Працавала даяркай у саўгасе «Арэхаўскі» (цяпер ДСУП «Сяльгас-Павіцце»). Агульны стаж яе работы на ферме 35 гадоў.

У 1971 годзе за плённую працу ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

**ЖУК Аляксандра Рыгораўна**. Жыхарка вёскі Павіцце. Працавала свінаркай у саўгасе «Арэхаўскі» (цяпер ДСУП «Сяльгас-Павіцце»). За высокія паказчыкі ў рабоце ўзнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені (1975), ордэнам Працоўнай Славы II ступені (1977).



**ЖУК Павел Антонавіч**. Нарадзіўся ў 1931 годзе. З 1957 па 1964 год працаваў у паляводстве, з 1965 года – шафёрам у саўгасе «Арэхаўскі» (цяпер ДСУП «Сяльгас-Павіцце»). Агульны стаж працы Паўла Антонавіча 38 гадоў, з якіх 30 ён працаваў вадзіцелем. Перавозіць на аўтамабілі ГАЗ прыходзілася розныя грузы, і асабліва напружанай была праца падчас уборачнай. Тысячы тон збожжа і бульбы, буракоў і кукурузы даставіў яго грузавік з поля на перапрацоўчыя прадпрыемствы.

Павел Антонавіч неаднаразовы пераможца ў сацыялістычным спаборніцтве. Атрымаў знак «Ударнік IX пяцігодкі». У 1976 годзе за высокія паказчыкі ў працы ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**САКАЛОЎСКІ Іван Васільевіч** (1940-2013). Нарадзіўся 15 сакавіка 1940 года ў вёсцы Повіць (цяпер Павіцце Кобрынскага раёна).

У 1971 годзе трактарыст Іван Сакалоўскі ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга за ўдзел у асваенні цалінных зямель на прасторы СССР.



**САЎЧУК Ганна Адамаўна**. Нарадзілася 28 кастрычніка 1944 года ў вёсцы Повіць (цяпер Павіцце Кобрынскага раёна).

У 1962 годзе паступіла на факультэт рускай і беларускай мовы Брэсцкага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна.

З 1967 года пачала працаваць у Павіццеўскай сярэдняй школе. Настаўнік вышэйшай катэгорыі.

У 1981 годзе Ганна Адамаўна Саўчук узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».



**ЦЕЦЯРУК Надзея Іванаўна**. Нарадзілася 14 студзеня 1949 года ў вёсцы Повіць (цяпер Павіцце Кобрынскага раёна) у шматдзетнай сям'і.

33 гады працавала даяркай у калгасе «40 гадоў Кастрычніка» (саўгас «Арэхаўскі», цяпер ДСУП «Сяльгас-Павіцце»). 25 кароў абслугоўвала яна штодня раніцай і ўвечары, пры гэтым 17 гадоў даіла ўручную, пакуль на фермах не ўсталявалі апараты машыннага даення.

Тройчы была ударнікам камуністычнай працы і пераможцам сацыялістычных спаборніцтваў X і XI пяцігодак.

У 1986 годзе Надзея Іванаўна Цецярук узнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

## Ганаровыя грамадзяне аграгарадка Павіцце Кобрынскага раёна

***Званне «Ганаровы грамадзянін аграгарадка Павіцце Кобрынскага раёна» прысвойваецца Павіццеўскім сельскім выканаўчым камітэтам за значны ўклад у сацыяльна-эканамічнае, культурнае развіццё аграгарадка, за пэўныя высокія дасягненні ў прафесійнай, грамадскай і дабрачыннай дзейнасці. Званне «Ганаровы грамадзянін аграгарадка Павіцце Кобрынскага раёна» прысвойваецца жыхарам і асобам, якія пражываюць па-за яго межамі, за адмысловыя заслугі перад аграгарадком.***

*2014 год*

**Мікалай Аляксандравіч Завержанец**
**Мікалай Анатольевіч Крывецкі**
**Васілій Мікалаевіч Мігіц**
**Вячаслаў Васільевіч Сашко**
**Уладзімір Георгіевіч Цюлін**

*2016 год*

**Іван Уладзіміравіч Канцэвіч**
**Іван Мікалаевіч Цецярук**
**Ганна Васільеўна Чопік**

*2017 год*

**Мікалай Рыгоравіч Брышцен**

**БРЫШЦЕН Мікалай Рыгоравіч** нарадзіўся 2 лютага 1950 года ў вёсцы Повіць (цяпер Павіцце Кобрынскага раёна). З малых гадоў пачаў маляваць.



Пасля заканчэння школы Мікалай працаваў у кобрынскім кінатэатры - маляваў афішы да фільмаў, у бытпрамкамбінаце. У 1968-1970 гадах служыў у Савецкай Арміі ў танкавых войсках.

З 1970 па 1975 год працаваў у Дзівінскай сярэдняй школе настаўнікам выяўленчага мастацтва. У 1975-1980 гадах - у Павіццеўскім лясніцтве на пасадзе «мастак-афарміцель».

1981-1984 - гады завочнай вучобы ў Пружанскім тэхнікуме, факультэт «Механізацыя сельскай гаспадаркі». Адзінаццаць гадоў быў механікам у Днепра-Бугскай гаспадарцы.

З 2000 года да пенсіі Мікалай Рыгоравіч працаваў у Павіццеўскай сярэдняй школе настаўнікам працоўнага навучання, вёў розныя гурткі. І сёння ў школе ёсць цэлая галерэя работ мастака, якія ён пакінуў школе.

У 2017 годзе за выдатную працу, адказныя адносіны да працы, асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё аграгарадка Павіцце Мікалай Рыгоравіч Брышцен удастоены звання «Ганаровы грамадзянін аграгарадка Павіцце Кобрынскага раёна» (рашэнне Павіццеўскага сельвыканкама ад 28.09.2017 г., № 68).

Знаходзячыся на заслужаным адпачынку, Мікалай Рыгоравіч займаецца любімай справай – піша карціны.

**ЗАВЕРЖАНЕЦ Мікалай Аляксандравіч** - кіраўнік сельскай гаспадаркі ў вёсцы Павіцце з 1973 года па 1986 год. У гады яго кіравання ў калгасе ў выніку асушэння зямель з'явіліся дадатковыя плошчы, якія сталі прыдатнымі для вырошчвання культур; умацоўвалася эканоміка гаспадаркі, рос матэрыяльны дастатак вяскоўцаў.



У 1979 годзе Мікалай Аляксандравіч узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

У 2014 годзе за асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё аграгарадка Павіцце Мікалай Аляксандравіч Завержанец рашэннем Павіццеўскага сельвыканкама № 116 ад 31 кастрычніка 2014 года ўдастоены звання «Ганаровы грамадзянін аграгарадка Павіцце Кобрынскага раёна».

Памёр Мікалай Аляксандравіч Завержанец у 2019 годзе.

**КАНЦЭВІЧ Іван Уладзіміравіч** (1936–2019). Нарадзіўся 2 лютага 1936 года ў вёсцы Повіць Кобрынскага павета (цяпер Павіцце Кобрынскага раёна). Закончыў 6 класаў мясцовай школы.



Пасля службы ў Савецкай арміі паехаў на сезонную працу ў Казахстан.

З 1960 года да пенсіі Іван Уладзіміравіч працаваў у калгасе: трактарыстам, брыгадзірам трактарнай брыгады, камбайнерам. З 1985 года Іван Канцэвіч быў майстрам-наладчыкам. Працаваў добрасумленна, стаў передавіком вытворчасці, выконваў дзяржаўныя планы.

У 1978 годзе Іван Уладзіміравіч узнагароджаны сярэбраным медалём «За дасягнутыя поспехі ў развіцці народнай гаспадаркі СССР».

У лістападзе 2016 года за асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё аграгарадка Павіцце Іван Уладзіміравіч Канцэвіч удастоены звання «Ганаровы грамадзянін аграгарадка Павіцце Кобрынскага раёна» (рашэнне Павіццеўскага сельвыканкама ад 22.09.2016 г., № 83).

**КРЫВЕЦКІ Мікалай Анатольевіч** нарадзіўся 5 красавіка 1949 года ў вёсцы Малінаўка Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці.



Закончыў Магілёўскую партыйную школу, Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ, Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію.

Працоўную дзейнасць пачынаў у сельскай гаспадарцы Драгічынскага раёна. Працаваў паляводам, брыгадзірам у калгасе «Савецкая Беларусь», намеснікам старшыні калгаса імя Кірава.

М. А. Крывецкі доўгі час знаходзіўся на адказных пасадах у органах дзяржаўнага кіравання, на партыйнай і савецкай рабоце. Паслужны спіс аднаго з ветэранаў дзяржслужбы ўключаў кіраўніцкія пасады ў чатырох раёнах Брэстчыны (Драгічынскім, Маларыцкім, Іванаўскім, Кобрынскім). У 1975-1985 гадах ён - інструктар Драгічынскага райкама КПБ, намеснік начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі Драгічынскага райвыканкама, інструктар,

намеснік загадчыка сельскагаспадарчага аддзела Брэсцкага абкама, другі сакратар Маларыцкага райкама КПБ, старшыня Іванаўскага райвыканкама.

З 1985 года па 1991 год - першы сакратар Кобрынскага гаркама КПБ. З сакавіка да снежня 1991 года - намеснік старшыні Савета калгасаў Брэсцкай вобласці.

У 1992-1996 гадах кіраваў Камітэтам па стварэнні СЭЗ «Брэст», у лістападзе 1996 года прызначаны кіраўніком Адміністрацыі СЭЗ «Брэст». Шмат у чым менавіта дзякуючы яго намаганням, вялікаму арганізатарскаму таленту, энергіі і дзяржаўнай мудрасці стала магчымым з'яўленне першай у рэспубліцы свабоднай эканамічнай зоны.

У 2008-2013 гадах Мікалай Анатольевіч - намеснік старшыні Брэсцкага райвыканкама.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, іншымі ўзнагародамі.

У кастрычніку 2014 года за асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё аграгарадка Павіцце Мікалай Анатольевіч Крывецкі ўдастоены звання «Ганаровы грамадзянін аграгарадка Павіцце Кобрынскага раёна» (рашэнне Павіццеўскага сельвыканкама ад 31.10.2014 г., № 116).

**МІГІЦ Васілій Мікалаевіч** нарадзіўся 11 лістапада 1955 года ў вёсцы Суботы Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і калгаснікаў.



Закончыў сярэднюю школу і паступіў на факультэт «Ахова раслін» Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута.

У 1978 годзе па размеркаванні трапіў у Віцебскую вобласць, потым пайшоў у армію, служыў ва Украіне. Працаваў на Маларыцкай станцыі аховы раслін.

З 1983 года Васілій Мікалаевіч - намеснік старшыні Кобрынскага аб'яднання сельгасхіміі, дзе працаваў 15 гадоў.

У 1997 годзе назначаны дырэктарам саўгаса «Арэхаўскі», якім кіраваў да 2004 года. Працаваў намеснікам старшыні Бярозаўскай сельгасхіміі.

У 2010 годзе па стане здароўя пайшоў на пенсію.

У кастрычніку 2014 года за асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё аграгарадка Павіцце Васілій Мікалаевіч Мігіц атрымаў званне «Ганаровы грамадзянін аграгарадка Павіцце Кобрынскага раёна» (рашэнне Павіццеўскага сельвыканкама ад 31.10.2014 г., № 116).

**САШКО Вячаслаў Васільевіч** нарадзіўся 16 верасня 1954 года ў вёсцы Мачулішчы Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці.



У 1976 годзе закончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі па спецыяльнасці «інжынер-механік».

Працоўную дзейнасць пачаў інжынерам па эксплуатацыі машынна-трактарнага парка калгаса «Усход» Камянецкага раёна. З 1981 года па 1983 год - намеснік старшыні калгаса «Расія», з 1983 па 1989 год - старшыня калгаса «Бальшавік».

У 1989-1997 гадах - першы намеснік старшыні Камянецкага райвыканкама - начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання.

З 1997 па 2006 год Вячаслаў Васільевіч быў старшынёй Пінскага райвыканкама. Са снежня 2006 года - дырэктар унітарнага вытворчага прадпрыемства «Брэстдругчормет».

Жыццё вёскі Павіцце цесна звязана з унітарным прадпрыемствам «Брэстдругчормет», якім з 2004 года кіраваў Вячаслаў Сашко. Снежань 2005 года стаў знакавым не толькі для КУСП «Арэхаўскае», але і для ўсяго аграгарадка Павіцце. Гаспадарка ўвайшла ў склад унітарнага прадпрыемства «Брэстдругчормет» і была рэарганізавана ў якасці філіяла ў ДСУП «Сяльгас-Павіцце». Пры дзейнай дапамозе Вячаслава Васільевіча, актыўным садзейнічанні кіраўнікоў УП былі вырашаны шматлікія важныя праблемы: тэхнічнае пераўзбраенне прадпрыемства, рэканструкцыя жывёла-гадоўчых ферм, аптымізацыя землекарыстання, павышэнне ўраджайнасці сельска-гаспадарчых культур і на гэтай аснове нарошчванне аб'ёмаў вытворчасці і рэалізацыя жывёлагадоўчай прадукцыі. Адначасова вырашаліся сацыяльныя пытанні аграгарадка.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 8 лістапада 2012 года № 500 Вячаслаў Васільевіч Сашко ўзнагароджаны дзяржаўным медалём «За працоўныя заслугі». Удастоены ордэна Рускай Праваслаўнай Царквы Прападобнага Сергія Раданежскага III ступені, ордэна Крыжа прападобнай Еўфрасінні Полацкай, ордэна Беларускай Праваслаўнай Царквы свяціцеля Кірыла Тураўскага II ступені, узнагароджаны нагрудным знакам Пагранічных войскаў «За дапамогу».

Рашэннем сесіі Пінскага раённага савета дэпутатаў ад 25.06.2013 года прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Пінскага раёна».

У кастрычніку 2014 года за асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё аграгарадка Павіцце Вячаслаў Васільевіч Сашко атрымаў званне «Ганаровы грамадзянін аграгарадка Павіцце Кобрынскага раёна» (рашэнне Павіццеўскага сельвыканкама ад 31.10.2014 г., № 116).

**ЦЕЦЯРУК Іван Мікалаевіч** (1954-2021). Нарадзіўся 28 чэрвеня 1954 года ў вёсцы Повіць (цяпер Павіцце Кобрынскага раёна). Пасля заканчэння сярэдняй школы ў 1968 годзе працаваў трактарыстам.



У 1972 годзе быў прызваны на службу ў Савецкую армію. Пасля службы вярнуўся на сваю малую радзіму, пайшоў працаваць трактарыстам. 36 гадоў працаваў у мясцовай гаспадарцы, 33 гады з іх – механізатарам. Выконваў дзяржаўны план калгаса, быў перадавіком вытворчасці.

У 1987 годзе Іван Мікалаевіч выбраны мясцовым дэпутатам.

У 1988 годзе І. М. Цецярук узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені.

Сышоў на пенсію, але працягваў працаваць. На заслужаным адпачынку лёс «перакваліфікаваў» нашага героя з механізатара ў навуковыя супрацоўнікі. З 2009 года Іван Мікалаевіч працаваў у рэспубліканскім ландшафтным заказніку «Званец», размешчаным на тэрыторыі Драгічынскага і Кобрынскага раёнаў.

За асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё аграгарадка Павіцце ў верасні 2016 года Івану Мікалаевічу Цецеруку прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін аграгарадка Павіцце Кобрынскага раёна» (рашэнне Павіццеўскага сельвыканкама ад 22.09.2016 г., № 83).

**ЦЮЛІН Уладзімір Георгіевіч** нарадзіўся 8 студзеня 1950 года ў горадзе Пружаны Брэсцкай вобласці. У 1967 годзе закончыў Ліноўскую сярэднюю школу Пружанскага раёна.



З сакавіка па лістапад 1968 года працаваў у Пружанскім раённым аб'яднанні «Сельгастэхніка», са снежня 1970 года па сакавік 1971 года - інструктар Пружанскага РК ЛКСМБ. З сакавіка па жнівень 1971 года быў інструктарам-метадыстам па спорце калгаса «Рассвет» Пружанскага раёна.

1971-1975 - гады вучобы ў Беларускім дзяржаўным інстытуце народнай гаспадаркі імя В. В. Куйбышава. З верасня 1980 года па ліпень 1982 года - слухач дзённага аддзялення Мінскай вышэйшай партыйнай школы.

У 1975-1977 гадах Уладзімір Георгіевіч працаваў галоўным эканамістам калгаса «Бальшавік» Кобрынскага раёна. З красавіка 1977 года па жнівень 1980 года - старшыня калгаса «Бальшавік». У 1982-1986 гадах - загадчык сельскагаспадарчым аддзелам Кобрынскага гаркама КПБ.

З мая 1986 года па 1997 год Уладзімір Георгіевіч - дырэктар саўгаса «Арэхаўскі» Кобрынскага раёна. У перыяд яго кіравання, акрамя меліярацыйнай сістэмы, былі пабудаваны рамонтна-механічныя майстэрні з гаражамі, стаянкамі для сельгастэхнікі, малочна-таварная ферма, збожжасховішчы, склад мінеральных угнаенняў.

З 1997 года Уладзімір Георгіевіч Цюлін - на кіруючых пасадах: дырэктар замежнага прадпрыемства «Леспром» г. Брэста, дырэктар ТАА «Фактар-сэрвіс» у г. Кобрыне, намеснік начальніка аддзела сацыяльнай абароны Кобрынскага райвыканкама, дырэктар ААТ «Гарадзецкі кансервавы завод», начальнік цэха па вытворчасці сыравіны Кобрынскага льнозавода, дырэктар КУП «Кобрынскі каапзагатпрам», дырэктар філіяла «Кобрынскі гарпалівазбыт».

За асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё аграгарадка Павіцце ў лістападзе 2014 года Уладзіміру Георгіевічу Цюліну прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін аграгарадка Павіцце Кобрынскага раёна» (рашэнне Павіццеўскага сельвыканкама ад 31.10.2014 г., № 116).

**ЧОПІК Ганна Васільеўна** (1934-2021). Нарадзілася 18 снежня 1934 года ў вёсцы Повіць (цяпер Павіцце Кобрынскага раёна) у вялікай сям'і. Дзяцінства было складаным. У сем гадоў Ганна пайшла пасвіць кароў. У школу хадзіла толькі два месяцы. Але гэтай кароткай навукі хапіла, каб вывучыць літары і потым чытаць у мясцовай царкве Евангелле.



Працавала Ганна Чопік у школе прыбіральшчыцай, потым 10 гадоў у лясніцтве рабочай. У калгасе «Труд» Кобрынскага раёна прарабіла 33 гады. Працуючы паляводам, неаднаразова была пераможцай у сацыялістычным спаборніцтве, выконвала дзяржаўны план. У свой час Ганна Васільеўна выбіралася членам праўлення калгаса і народным засядацелем.

За асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё аграгарадка Павіцце ў 2016 годзе Ганне Васільеўне Чопік прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін аграгарадка Павіцце Кобрынскага раёна» (рашэнне Павіццеўскага сельвыканкама, 22.09.2016, № 83).

***На зямлі ёсць мясціны, на першы погляд, непрыметныя, але яны валодаюць асаблівай магнетычнай сілай, утульнасцю.***

***Шматпакутная зямля, вядомая з глыбіні вякоў; зямля, якая захоўвае нямала гістарычных звестак доблесці і мужнасці продкаў; зямля, праслаўленая гераічнымі і працоўнымі здзяйсненнямі. Такой з'яўляецца для павіцян іх малая радзіма. Гэты куток Кобрыншчыны адразу і назаўсёды заварожвае сваёй прыгажосцю, няспешнасцю і мернасцю жыцця, нейкай асаблівай мудрасцю.***

***Кожны год 9 кастрычніка жыхары Павіцця ўрачыста адзначаюць храмавае свята мясцовай царквы ў гонар Раства Прасвятой Багародзіцы і свята роднай вёскі. Гэтай урачыстасці чакаюць усе павіцяне, таму што ў гэты восеньскі дзень Павіцце расквітае яркімі фарбамі, напаўняецца гукамі вясёлых мелодый, старадаўніх і сучасных песень, задорным смехам, светлымі ўсмешкамі і водарамі пачастункаў, разнастайных страў. Святочная атмасфера пануе ў кожным сельскім двары, нясе добры настрой у кожную сям'ю і саграває сэрца кожнага.***

***Свята, юбілейная дата вёскі – гэта цёплая сустрэча пакаленняў, урачыстае ўшанаванне працоўных дынастый, дакрананне да народных традыцый.***

# СПІС КРЫНІЦ

**Бриштен, А. П.** Воспоминания о былом / Бриштен А. П. – Брест : Издательство С. Лаврова, 2000. – 104 с : ил.

**Дзехцярук Уладзімір Іванавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 433. – (Імі ганарацца землякі).

**Земля** и люди Повитья / автор текста Н. С. Васюк ; редактор П. Н. Тишук. – Брест, 2014. – 43 с.

Брошюра о Повитьевском крае, изданная в связи с 65-летием создания коллективного хозяйства.

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. **Кузіч Уладзімір Рыгоравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 429. – (Вызначыліся працай).

**Известные** люди. **Кузич Владимир Григорьевич** // Азбука моей малой родины : 505-летию д. Стригово посвящается / Кобринская районная централизованная библиотечная система. Учреждение культуры «Стриговская публичная библиотека», Отдел образования, спорта и туризма Кобринского райисполкома. Учреждение образования «Стриговский детский сад - средняя школа», Стриговский центр культуры и досуга ; под ред. С. Д. Курачук. – Кобрин, 2018. – С. 13.

**Князева, В. М.** Павіцце / В. М. Князева // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 599. – (З гісторыі населеных пунктаў).

**Кузич, М.** Моя малая Родина – с. Повитье. Исторические повествования. Заметки [Электронный ресурс] / Михаил Кузич // Одноклассники. – Режим доступа: https://ok.ru/profile/ 564323201431/statuses. – Дата доступа: 08.08.2021.

**Кузич Владимир Григорьевич** // Кто есть Кто в Республике Беларусь : справочное издание. – Минск, 2005. – Т. 2. – С. 186.

**Лаўрэцкі, Г. А.** Павіццеўская Прачысценская царква / Г. А. Лаўрэцкі // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2000. – Т. 11. – С. 470.

**Мароз, В. В.** XII стагоддзе. Павіцце / В. В. Мароз // Драўляныя сакральныя помнікі Берасцейшчыны : нарысы гісторыі, археалогіі і культуры / В. В. Мароз. – Мінск, 2018. – С. 177-178.

**О порядке** присвоения звания «Почетный гражданин аг. Повитье Кобринского района» : утв. решением Повитьевского сельского исполнительного комитета, 31.10.2014 г., № 115. – Повитье, 2014.

**Об учреждении** звания «Почетный гражданин аг. Повитье «Кобринского района» и утверждении Положения о порядке присвоения звания «Почетный гражданин аг. Повитье Кобринского района» : решение Повитьевского сельского исполнительного комитета, 31 октября 2014 г., № 115. – Повитье, 2014.

**Павіцце** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1973. – Т. 7. – С. 590.

**Павіцце** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2000. – Т. 11. – С. 470.

**Павіцце** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Т. 4. Брэсцкая вобласць. – Мінск, 2007. - Кн. 2. - С. 175.

**Повитье** // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. - Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 242.

**В. Повитье**, центр сельсовета. Братская могила партизан и жертв фашизма. Памятник землякам // Свод памятников истории и культуры Белоруссии. Брестская область. – Минск, 1990. - С. 261.

**Повитьевская** церковь Рождества Богородицы // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. - Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 242-243 : фото.

**Помнік**і архітэктуры. Вёска Павіцце, цэнтр сельсавета. **Прачысценская царква** (1911). Помнік архітэктуры псеўдарускага стылю ў эклектыцы // Гісторыка-культурная спадчына Кобрыншчыны. – Баранавічы, 2001. – С. 12.

**Пятросава, А. Ю**. В. Павіцце, цэнтр сельсавета. Брацкая магіла савецкіх воінаў. Прачысценская царква / А. Ю Пятросава // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць. – Мінск, 1984. – С. 235.

**Свята-Прачысцінская** царква ў в. Павіцце // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 467. – (Архітэктурная спадчына Кобрыншчыны).

**Тетерук, А.** Ноктюрн Полісся : [песня на словы А. Тетерука, Т. Сергійчука] / Арсень Тетерук // Справа : альманах. - Мінск, 2015. – Вып. 2. - С. 232.

**Тетерук, А.** Пісні мого села [ноты] : українські народні пісні, записані на Берестейщині, та сучасні авторські твори : [для народнага хору без суправаджэння] / упорядник Арсень Тетерук. - Луцьк : Твердиня, 2010. - 138, [1] с.

**Тетерук, А.** Поліські передзвони [ноты] : [для голасу, хору без суправаджэння] / Арсень Тетерук. - 2–е выд., перапрацаванае і дапоўненае. - Мінск : Смэлтак, 2019. - 243 с. - (Голоси з Берестейщини).

**Тетерук Арсентий Николаевич** // Кто есть Кто в Республике Беларусь. Архитекторы Беларуси. – Минск, 2014.

**Цецярук, А**. Поліські передзвони [ноты] : аўтарскія песні : [для хору без суправаджэння] / Арсень Цецярук. - Брэст : Альтернатива, 2016. - 95 с.

**Ширко, В.** Стриговские горизонты : документальная повесть о Заслуженном работнике сельского хозяйства Республики Беларусь В. Г. Кузиче / Василь Ширко. – Минск : Парадокс, 2017. – 191 с. : ил.

**Бакун, А**. Фестываль сустрэч / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. – 2021. – 2 чэрвеня. – С. 6 : фат.

Настаўнікі Павіццеўскага дзіцячага сада-сярэдняй школы Кобрынскага раёна арганізоўваюць анлайн-сустрэчы з цікавымі людзьмі.

**Вовк, Ю.** Формула педагогического мастерства / Юлия Вовк ; фото из личного архива Натальи Тетерук // Кобрин-информ. - 2021. — 11 марта (№ 10). — С. 3 : фот.

Учитель Повитьевского детского-сада-средней школы Н. В. Тетерук награждена поощрительной премией специального фонда Президента Республики Беларусь за личный вклад в развитие способностей одаренных учащихся.

**Цецярук, Н**. Літаратурныя сустрэчы / Наталля Цецярук // Настаўніцкая газета. - 2021. — 27 красавіка (№ 47). — С. 15.

Пра кніжны анлайн-фестываль у Павіццеўскай сярэдняй школе Кобрынскага раёна.

**Цецярук, Н. В.** «Мой гонар — мае вучні» / [Наталля Цецярук ; запісала] Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2021. - 6 сакавіка (№ 19-20). - С. 6 : фат.

Пра настаўніцу Павіццеўскага дзіцячага сада-сярэдняй школы Н. В. Цецярук.

**Бакун, Е.** Воспитание через музейную деятельность / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2020. — 21 лістапада (№ 90). — С. 10 : фот.

Совет историко-этнографического музея «Палешукі» Повитьевского детского сада-средней школы получил диплом областного этапа республиканского конкурса.

**Бакун, А.** З любоўю да зямлі роднай / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2020. — 15 студзеня. — С. 6 : фат.

Павіццеўскі дзіцячы сад-сярэдняя школа – адна з самых прагрэсіўных устаноў адукацыі Кобрынскага раёна.

**Бялоў, Д**. Вячаслаў Сашко: «Жыццё навучыла верыць людзям» / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. – 2020. – 29 лютага. – С. 3 : фат.

Былы дырэктар унітарнага прадпрыемства В. Сашко прымаў актыўны ўдзел у жыцці аграгарадка Павіцце.

**Пашковіч, Л**. Вялікая памяць у маленькіх сэрцах / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2020. — 8 мая (№ 35). — С. 10 : фат.

У Павіццеўскім дзіцячым садзе - сярэдняй школе вядзецца работа па патрыятычнаму выхаванню моладзі.

**Пашкович, Л.** К доктору на прием / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2020. — 23 верасня (№ 74). — С. 5 : фот.

О работе заведующей Повитьевской амбулатории врача общей практики М. Ф. Гелемент.

**Пашковіч, Л. В**. На культурнай сцяжынцы / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2020. — 23 верасня (№ 74). — С. 5 : фот.

Пра развіцце культуры на вёсцы расказала загадчык Павіццеўскага Дома культуры Н. М. Астапук.

**Пашкович, Л.** Повелительница формул / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2020. — 23 верасня (№ 74). — С. 5 : фот.

Об учителе математики ГУО «Повитьевский детский-сад — средняя школа» В. Н. Терещук.

**Савчук, М.** От школьных исследований к будущей профессии / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2020. — 21 мая (№ 21). — С. 3 : фот.

Учащиеся ГУО «Повитьевский детский-сад — средняя школа» активно занимаются учебно-исследовательской деятельностью.

**Яскевіч, С.** Гаспадарскі падыход / Святлана Яскевіч // Звязда. - 2020. — 17 студзеня (№ 10). — С. 15 : фот.

Пра жыццё Павіццеўскага сельсавета, які уключае толькі адзін аграгарадок Павіцце.

**Яскевіч, С.** Паглядзець на землякоў іншымі вачыма / Святлана Яскевіч // Звязда. - 2020. — 13 сакавіка (№ 10). — С. 3 : фат.

У аграгарадку Павіцце адбылася сустрэча былых салдат-землякоў тэрміновай службы, прымаўшых удзел у Афганскай вайне.

**Вовк, Ю.** Наталья Тетерук: «Учитель может невозможное сделать возможным» / Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2019. — 3 октября (№ 40). — С. 3.

Фотография учителя белорусского языка и литературы Повитьевского детского сада-средней школы Н. Тетерук занесена на Доску почета Кобринского района.

**Нікалаева, Н**. Змяніць школу і ... сябе / Надзея Нікалаева // Звязда. - 2019. — 7 жніўня. — С. 5.

Дзве Наталлі Цецярук, настаўніцы школы аг. Павіцце, — сярод пераможцаў праекта «Настаўнік для Беларусі».

**Павіццеўск**і куточак : тэматычная старонка // Кобрынскі веснік. - 2019. — 7 жніўня. — С. 4.

**Пасияк, О**. Учись учить / Ольга Пасияк ; фото Василия Пивоварчика // Советская Белоруссия. - 2019. — 18 декабря (№ 240). — С. 1, 14 : фот.

Два педагога Повитьевского детского сада-средней школы Кобринского района участвуют в проекте «Учитель для Беларуси».

**Пашковіч, Л.** Гарачы абед у гарачую пару / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2019. — 7 жніўня. — С. 4 : фот.

У сталовай ДСУП «Сяльгас-Павіцце» рыхтуюць смачныя абеды і вячэры.

**Пашковіч, Л.** Новыя кулісы — у падарунак / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2019. — 7 жніўня. — С. 4 : фот.

У Павіццеўскім Доме культуры — новыя кулісы ад спонсара.

**Пашковіч, Л**. Па слядах юных краязнаўцаў / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2019. — 7 жніўня. — С. 4 : фот.

Са злёту лепшых краязнаўцаў вобласці каманда Павіццеўскага дзіцячага-сада-сярэдняй школы прывезла 9 дыпломаў.

**Яскевіч, С.** Капялюш з пяром / Святлана Яскевіч // Звязда. - 2019. - 28 снежня (№ 246). — С. 1, 3 : фот.

Пра захаванне традыцыйнага касцюма ў в. Павіцце Кобрынскага раёна.

**Бакун, А.** Руская — па пашпарце, беларуска — у душы / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2018. — 6 кастрычніка. — С. 1, 3.

Настаўніца беларускай мовы і літаратуры Павіццеўскага дзіцячага сада-сярэдняй школы Н. Цецярук знайшла сваё месца ў жыцці.

**Бакун, А.** Служыць зямлі і людзям / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2018. — 14 сакавіка. — С. 5.

Старшыня Павіццеўскага сельвыканкама М. Сухарэвіч аддаў працы на роднай зямлі і служэнню сваім землякам 37 гадоў.

**Бакун, А.** Шчасце — гэта любімая работа / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2018. — 14 сакавіка. — С. 3.

Паспяховую работу начальнік Павіццеўскага аддзялення сувязі А. Жук звязвае са сваім калектывам.

**Павіццеўскі** куточак : тэматычная старонка // Кобрынскі веснік. - 2018. — 24 студзеня. — С. 4 ; 2 чэрвеня. — С. 4.

**Пашковіч, Л.** Душа патрабуе дапамагаць ... / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2018. — 2 чэрвеня. — С. 4.

Сацыяльны работнік П. Брышцен з в. Павіцце не баіцца ніякай работы.

**Пашковіч, Л.** Па лесе ходзіць чалавек ... / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2018. — 24 кастрычніка. — С. 4.

Васямнаццаць гадоў жыцця прысвяціў Павіццеўскаму лясніцтву Кобрынскага доследнага лясгаса В. П. Шынкарук.

**Пашковіч, Л.** Узнагарода за каханне и лад / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2018. — 2 чэрвеня. — С. 4.

Сям'я Брышцен з в. Павіцце атрымала дыплом агляда-конкурса «Шматдзетная сям'я года».

**Пашковіч, Л.** Шыкоўная настаўніца / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2018. — 24 студзеня. — С. 4.

Вучні Павіццеўскага дзіцячага сада-сярэдняй школы атрымліваюць прызавыя месцы ў раённых конкурсах і алімпіядах.

**Цвирко, В.** 150 золотых маршрутов моей Беларуси: Повитье : авторский проект Владимира Цвирко / Владимир Цвирко ; материал подготовила Юлия Лабецкая // 7 дней. - 2018. — 22 февраля. — С. 24, 25.

Храмы деревень Кобринщины: Верхолесье, *Повитье*, Дивин, Новоселки, Хабовичи.

**Бакун, А.** Падмурак патрыятызму / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. — 13 мая. — С. 4.

У Павіццеўскім дзіцячым саду-сярэдняй школе працуе гісторыка-краязнаўчы музей «Палешукі».

**Марчук, Н.** Ординарец Нестора Махно / Нина Марчук // Кобрин-информ. - 2017. — 17 августа. — С. 4.

Ординарец Н. Махно проживал в д. Повить с 1922 по 1979 год.

**Павіццеўскі** куточак : тэматычная старонка // Кобрынскі веснік. - 2017. — 22 красавіка. — С. 4 ; 12 ліпеня. — С. 4 ; 6 снежня. — С. 5.

**Пашковіч, Л.** Божая любоў у дзіцячых сэрцах / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2017. — 22 красавіка. — С. 4.

З 2004 года з прыходам іерэя Віктара Бойціка ў царкву Раства Прасвятой Багародзіцы ў Павіцце, пачала дзейнічаць нядзельная школа.

**Пашковіч, Л.** Дом, дзе жыве вялікае каханне / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2017. — 6 снежня. — С. 5.

Мнагадзетная працавітая сям'я Любчук з в. Павіцце.

**Пашковіч, Л.** Захавальніца фальклорнага багацця / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2017. — 6 снежня. — С. 5.

Таленты і жыццевая энергія жыхаркі в. Павіцце А. П. Базылюк.

**Пашкович, Л**. Из механизаторов — в научные сотрудники / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2017. — 22 красавіка. — С. 4.

В 2016 году И. Н. Тетерук стал Почетным гражданином агрогородка Повитье.

**Пашковіч, Л.** Карысныя сустрэчы / Людміла Пашковіч, Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2017. — 17 мая. — С. 3.

У рамках Адзінага дня інфармавання адбылася сустрэча інфармацыйна-прапагандысцкіх груп з насельніцтвам аг. Дзівін, Павіцце і в. Лелікава.

**Пашковіч, Л.** Мастак па жыцці / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2017. - 22 красавіка. - С. 6.

Пра мастака з в. Павіцце, Ганаровага грамадзяніна аграгарадка Павіцце М. Р. Брышцена.

**Пашковіч, Л.** Парадак наводзіцца разам / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2017. — 12 ліпеня. — С. 4.

Павіццеўскім сельвыканкамам сумесна з насельніцтвам праводзіцца вялікая работа па добраўпарадкаванні і навядзенні парадку на зямлі.

**Пашковіч, Л.** Шчасце вялікай сям`і / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2017. — 12 ліпеня. — С. 4.

У аграгарадку Павіцце 29 шматдзетных сямей.

**Шепелевич, И.** Радость Рождества в деревне Повитье / Ирина Шепелевич // Брестский курьер. - 2017. — № 3 (январь). — С. 8.

В д. Повитье Кобринского района сохранились традиции проведения Рождества.

**Яскевіч, С.** У Павіцці паспакайнела / Святлана Яскевіч // Звязда. - 2017. — 7 лютага. — С. 3.

У в. Павіцце прымаюцца неабходныя меры бяспекі.

**Кирьянов, А.** Из-за леса, из болот / Артем Кирьянов // Народная газета. - 2016. — 27 мая. — С. 22, 23.

О деятельности бандитских формиований ОУН и УПА на трерритории Кобринского района (деревни Дивин, Повить, Леликово).

**Марчук, Н.** Село Повить: расцвет и трагедия / Нина Марчук // Кобрин-информ. - 2016. — 7 января. — С. 5.

История деревни Повить.

**Павіццеўскі** куточак : тэматычная старонка // Кобрынскі веснік. - 2016. —10 жніўня. — С. 5 ; 8 кастрычніка. — С. 9 ; 14 снежня. — С. 3.

**Пашковіч, Л.** Без працы не ўяўляецца жыццё / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2016. — 8 кастрычніка. — С. 9.

Аб адной са старэйшых жыхарак в. Павіцце Ганне Чопік.

**Пашковіч, Л.** Іголкай, нібы пэндзлем, малюе... / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2016. — 10 жніўня. — С. 5.

Вышытыя работы майстрыхі з Павіцця А. Тарасюк былі прадстаўлены ў час тэатралізаваных падворкаў на Дне горада.

**Пашкович, Л.** Ловись, рыбка! / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2016. — 8 кастрычніка. — С. 9.

В фермерском хозяйстве «Желтая лилия» д. Повитье занимаются разведением рыбы с 2009 года.

**Пашковіч, Л.** Павіццеўскі куточак / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2016. — 8 кастрычніка. – С. 9.

Свята-Прачысценская царква в. Павіцце.

**Пашковіч, Л.** Сустрэліся аднойчы і назаўседы / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2016. — 10 жніўня. — С. 5.

Пра мнагадзетную сям`ю Брыштэн з вёскі Павіцце.

**Пашковіч, Л.** Такі прыемны паштальён / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2016. — 14 снежня. — С. 3.

Старанна і з задавальненнем працуе на пошце ў в. Павіцце Г. М. Канцэвіч.

**Пашковіч, Л.** У поле - з добрым настроем / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2016. — 10 жніўня. — С. 5.

На доўжным узроўні праходзіць уборачная кампанія ў ДСУП «Сяльгас-Павіцце».

**Пашковіч, Л**. Ферма - лепшы ўзор парадку / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2016. — 10 жніўня. — С. 5.

У належным стане падтрымліваецца тэрыторыя фермы ДСУП «Сяльгас-Павіцце».

**Пашковіч, Л**. «Я вырасла на ферме» / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2016. — 14 снежня. — С. 3.

Шмат гадоў Н. А. Палявода працуе загадчыкам фермы ў ДСУП «Сяльгас-Павіцце».

**Яскевіч, С**. Ваўкі ў Павіцці / Святлана Яскевіч // Звязда. - 2016. - 16 снежня. - С. 3.

Да ліквідацыі воўчай зграі, якая тэрарызуе в. Павіцце, падключыліся многія службы.

**Савчук, М.** Дружная семья - залог успеха / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2014. — 22 мая. — С. 5.

Лучшей многодетной семьёй Кобринщины была признана семья Падкович из д. Повитье.

**Аб узнагароджанні** мнагадзетных маці ордэнам Маці : Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь,19 верасня 2013 г., № 438 // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. - 2013.— № 37. — С. 14.

За нараджэнне і выхоўванне пяці і больш дзяцей узнагароджаны ордэнам Маці: па Брэсцкай вобласці : Канцэвіч Н. А. (хатнюю гаспадыню, в. Павіцце).

**Бялоў, Д.** Аляксандр Зазуля: «Такая гаспадарка проста не мае права знаходзіцца сярод адстаючых» / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2013.— 23 лістапада. — С.1,2.

Сельскагаспадарчы філіял «Арэхаўскі».

**Помняць** трэнера ў Павіцці // Народная трыбуна. - 2013. — 17 мая. — С. 3.

У Павіцці прайшоў турнір па валейболу памяці вядомага беларускага спартсмена і трэнера Уладзіміра Брыштэна.

**Собчук, Б.** Его пример вдохновляет земляков / Борис Собчук // Кобрынскі веснік. – 2013. – 11 мая. – С. 4.

О Владимире Бриштене – спортсмене, тренере, родом из д. Повитье.

**Инициатива**, ответственность, бережливость // Народная газета. - 2012. - 19 красавіка. - С. 1.

На месте непроходимых болот вокруг д. Повитье уже работает техника.

**Духовный** центр села Повитье // Кобрынскі веснік. - 2011. - 8 кастрычніка. - С. 12.

В октябре 2011 года Свято-Рождество-Богородичный храм д. Повитье отметил 100-летие.

**Павлова, Л.** Привела меня доля в рай / Любовь Павлова // Брестский курьер. - 2011. - № 1. - 6 января. - С. 9.

О преподавателе Брестской детской художественной школы, фольклористе А. Тетеруке (к его 70-летию), уроженцу д. Повитье.

**Повитье**: статус агрогородка обязывает ко многому // Кобрин-информ. - 2011. - 3 февраля. - С. 1, 3.

Повить приобрела статус агрогородка.

**Саўчук, П.** Бяздоннае месца / П. Саўчук // Народная газета. - 2011. - 20 мая. - С. 15.

Гісторыя назвы вёскі Павіцце Кобрынскага раёна.

**Тишук, П.** Век служения православной вере / Петр Тишук // Вечерний Брест. - 2011. - 12 октября. - С. 9 ; Кобрынскі веснік. - 2011. - 15 кастрычніка. - С. 2.

Храм в д. Повитье отметил 100-летие.

**Сацук, А.** Газ пришёл в Повитье / А. Сацук // Кобрынскі веснік. - 2010. - 7 жніўня. – С. 2.

В д. Повитье обустраивается агрогородок.

**Бялоў, Д.** Праблемы, якія вырашаюцца / Д. Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2010. - 7 красавіка. - С. 1-2.

Вёска Павіцце ў хуткім часе будзе аграгарадком.

**Віншуем** з узнагародай // Заря. - 2010. - 23 сентября. - С. 1,3.

Сярод узнагароджаных ордэнам Маці - работнік ДУА «Павіццеўскі дзіцячы сад – сярэдняя школа» Л. В. Гамалюк.

**Жук, Е.** И в Повитье будет газ / Е. Жук // Вечерний Брест. - 2010. - 9 июля. - С. 7. -

Газопровод в д. Повитье.

**Сацук, А.** Буслы над вёскай / А. Сацук // Кобрынскі веснік. - 2010. – 21 красавіка. – С. 3.

Добраўпарадкаванне вёскі Павіцце.

**Павлова, Л.** Песнями повитое село приветило своего земляка-композитора / Любовь Павлова // Брестский курьер. - 2010. - № 42. - 14 октября. - С. 10.

О презентации книги А. Теteрука «Песни моего села» в селе Повитье Кобринского района (10 окт.).

**Пянко, А.** Единство слова и дела / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. - 2008. - 6 верасня. - С. 8.

Пречистинская церковь в д. Повитье.

**Альшова, И.** Художник - это состояние души / Ирина Альшова // Брестский вестник. - 2007. - 13 сентября. - С. 16.

О выставке акварелей А. Н. Тетерука в детской художественной школе.

**Гармель, Е.** Счастливая судьба привела в Повитье / Елена Гармель // Заря. - 2007. - 24 марта. - С. 8.

Дмитрий Гусев – молодой учитель Повитьевского детского сада – средней школы.

**Баранчук,** О. Словом и делом / О. Баранчук // Кобрынскі веснік. – 2006. – 20 верасня. – С. 3.

Повитьевской церкове - 95.

**Марчук, Н.** Адсвяткавалі 95-годзе / Н. Марчук // Белорусская нива. – 2006. – 1 апреля.

**Панасюк, Н.** В будущее - с родным селом / Н. Панасюк // Белорусская нива. – 2006. – 22 февраля. – С. 2.

**Пянко, А.** Праздник в кругу друзей / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 2006. – 11 кастрычніка. – С. 1, 2.

460 лет д. Повить, 95 лет со дня освящения местного храма.

**Пятроўская, М.** Ладзяць вяселлі і будуюць дамы / М. Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 2005. – 16 лютага. - С. 2.

**Пятроўская, М.** Павіццеўскія навіны / М. Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 2005. – 19 студзеня. – С. 3.

**Ролич, О**. Три жизни одной церкви / Ольга Ролич // Заря. – 2006. – 11 февраля. – (Храмы Брестчины).

О церкви в д. Повитье.

**Хильчук, М.** Переплелись легенды и история / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2005. – 28 верасня. – С. 3.

**Хильчук, М.** Повитье хорошеет / М. Хильчук // Кобрынскі веснік. – 2005. - 16 ліпеня. – С. 1.

**Максімчык, А.** Духоўнае ўзвышэнне / А. Максімчык // Кобрынскі веснік. – 2004. – 24 лістапада. – С. 2.

Добраўпарадкавана Свята-Прачысцінская царква ў в. Павіцце.

**Пянко, А.** З вёскай развітацца не плануе / Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2004. – 13 лістапада. - С. 1.

Аляксандр Сакадын – урач-стаматолаг Павіццеўскай амбулаторыі.

**Пятроўская, М.** Натхнілі радкі з мінулага / М. Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 2004. – 25 лютага. – С. 3.

Добраўпарадкаванне в. Павіцце.

**Пятроўская, М.** Павіццеўскія навіны / М. Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 2003. – 22 ліпеня. – С. 3.

**Пятроўская, М**. Павіцце прыгажэе / М. Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 2003. – 3 мая. – С. 6.

**Коренчук, П.** Деревенька моя… / П. Коренчук // Кобрынскі веснік. – 2000. – 2 жніўня. – С. 3.

Об истории названий деревень Городецкого, Онисковичского с/с, д. Повить.

**Петров, Ю.** «Журавли» средь Повити стоят / Ю. Петров // Заря. – 1999. – 25 февраля. – С. 2 : фот.

**Сацук, А.** Каб стала ніва ўражайнай / А. Сацук // Кобрынскі веснік. – 1998. – 22 красавіка.

Дырэктар саўгаса «Арэхаўскі» В. М. Мігіц – аб добрай арганізацыі веснавых палявых работ.

**Так** выглядае сёння цэнтр в. Павіцце // Кобрынскі веснік. – 1993. – 13 лістапада.

**Сабчук, П.** Свабода ішла з усходу : да 50-годдзя ўз’яднання Беларусі / П. Сабчук, А. Брыштэн // Камуністычная праца. – 1989. – 5 верасня.

**Камяндант, С.** Сучаснае і мінулае вёскі Павіцце / С. Камяндант // Камуністычная праца. – 1977. – 10 лістапада.

**Дудко, И.** Встреча с будущим / И. Дудко // Заря. – 1968. - 24 декабря.

Жители Повити обсуждают перспективу застройки деревни.

**Брыштэн, А. П.** Ганаруся табой, Кобрыншчына / А. П. Брыштэн // Камуністычная праца. – 1967. – 21 лютага.

Пісьмо ў рэдакцыю газеты ад ураджэнца в. Павіцце аб зменах у жыцці вёскі за гады Савецкай улады.

## *Бібліяграфічныя выданні*

**Юбілейныя** даты населеных пунктаў Кобрынскага раёна. **Павіцце** – 475 гадоў з часу першага ўпамінання (1546) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 9.

**Юбілейныя** даты вёсак Кобрынскага раёна. **Павіцце** – 470 гадоў // Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016 год / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2016. - С. 22-25.

**Ганаровыя грамадзяне аграгарадка Павіцце** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2020. – С. 61-74.

**Завержанец Мікалай Аляксандравіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 52 : фат.

**Кузіч Уладзімір Рыгоравіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук. – Кобрын, 2018. – С. 43-45 : фат.

**Кузіч Уладзімір Рыгоравіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 130-132 : фат.

**Цецярук Іван Мікалаевіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 79-80.

**85 гадоў** з дня нараджэння У. Р. Кузіча (1940) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская РЦБС, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 171.

# СПІС ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯЎ,
## матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік

Белорусская нива

Брестский курьер

Вечерний Брест

Заря

Звязда

Камуністычная праца

Кобрин-информ

Кобрынскі веснік

Культура

Народная газета

Народная трыбуна

Настаўніцкая газета

Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь

7 дней

СБ Беларусь сегодня (Советская Белоруссия)


1546
ПАВІЦЦЕ